ЧАМУ ПАКУЛЬ НЕЛЬГА ВЫХОДЗІЦЬ НА ЛЁД? 6

ВОЛЬГА ШПІЛЕЎСКАЯ: «СЛОВА МОЖА РАЗВЯЗАЦЬ ВАЙНУ». 19

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 СНЕЖНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 239 (29608)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр СУБОЦІН, намеснік прэм'ер-міністра:

«Дакладнае земляробства, у тым ліку лічбавізацыя сельскай гаспадаркі, справа не толькі важная, але і неабходная. Гэты працэс закліканы ў разы павялічыць эфектыўнасць работы той ці іншай галіны. Таму дакладнае земляробства — адзін з найважнейшых сегментаў лічбавізацыі. У гэтым працэсе шмат плюсоў: эканомія паліва падчас апрацоўкі глебы, унясенне неабходнай колькасці ўгнаенняў, падбор культур для вызначанага ўчастка і гэтак далей. Усё гэта садзейнічае павышэнню эфектыўнасці і атрыманню больш якаснага і большага аб'ёму ўраджаю. Такая работа прынясе адчувальную карысць людзям, якія працуюць на зямлі».

НАЙЛЕПШЫ ВІД НА САЛЮТ

Мінск. Навагодняе ўбранства сталіцы амаль завершана: на традыцыйных пляцоўках усталяваны красуні ёлкі, якія зусім хутка — 15 снежня — запаляцца гірляндамі і лямпачкамі. На галоўнай плошчы святкавання (каля Палаца спорту), дзе размесціцца гандлёвыя домікі традыцыйнага калядnага кірмашу і пройдзе масавае гуляння ў навагоднюю ноч, завяршаецца маляўнічае афармленне святочнай тэрыторыі: як і заўсёды, яно будзе непаўторным у мастацкім і канцэптуальным вырашэнні.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- Пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета пройдзе сёння ў відэафармаце.
- **Колькасць выхаванцаў інтэрнатаў у Беларусі з 1995 года скарацілася больш як у 9 разоў.**
- Сезон калядных кірмашоў стартуе ў Мінскай вобласці 11 снежня.
- **Навагодні кадэцкі баль пройдзе ў Магілёве 20 снежня.**
- У Мінску адкрылі біятлонную базу СДЮШАР па зімовых відах спорту.
- **Мюзікл «Ноч перад Калядамі» прадставяць у Гомельскім маладзёжным тэатры.**
- У Старых Дарогах адкрыўся сучасны ФАК «АкваСтар» з басейнам для дарослых і малых.

Вышэйшая школа

ІНАВАЦЫЙНАЕ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА І ЛІЧБАВЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ...

Як падрыхтаваць запатрабаванага і канкурэнтаздольнага спецыяліста?

Фота БелТА.

Шчыльная работа з заказчыкамі кадраў, актыўная прафарыентацыйная работа і магутная каманда ўнутры ВНУ, якая не баіцца змен і здольная ўвасабляць іх у жыццё, — вось тры ўмовы для адкрыцця ў навучальных установах новых спецыяльнасцяў.

СТАР. 4

Рабіць дабро

Паўдзельнічаць зможа кожны!

З 14 снежня стартуе акцыя «Нашы дзеці»

Традыцыйная дабрачынная рэспубліканская акцыя «Нашы дзеці», прымеркаваная да навагодніх і калядных свят, пройдзе па ўсёй краіне з 14 снежня бягучага года да 14 студзеня наступнага. Яе сёлетняй адметнасцю стане тое, што зрабіць добрую справу і аказаць пасільную дапамогу дзецям зможа кожны. А ў мерапрыемствах акцыі возьме ўдзел каля мільёна малых. Штогод у гэты час адкрываюцца і новыя памяшканні, пабудаваныя за сродкі бюджэту для дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. Атрымаюць ключы ад такіх кватэр гэтыя сем'і і сёлета.

Старт акцыі «Нашы дзеці» будзе дадзены 14 снежня ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. У ім возьмуць удзел дзеці не толькі са сталіцы, але і з рэгіёнаў — пераможцы алімпіяд, творчых конкурсаў, спартыўных спаборніцтваў, а таксама дзеці з прытулкаў, апякунскіх і прыёмных сем'яў. У кожным з абласных цэнтраў таксама пройдзе такое ж урачыстае адкрыццё акцыі «Нашы дзеці».

СТАР. 4

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцавы

ISSN 1990 — 763X

Пятае інтэрв'ю за паўтара месяца

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні турэцкай тэлерадыёкампаніі «TRT»

У якасці інтэрв'юера выступіла вядучая асноўнага навінавага тэлеканала кампаніі «TRT Haber» Ніса Эфендыяглу. Журналіст уваходзіць у пул асабістай прэсы Прэзідэнта Турцыі Рэджэпа Таіпа Эрдагана.

Фота Бел ТА.

У інтэрв'ю ўзнімаліся тэмы міграцыйнага крызісу, ціску на Беларусь, санкцый Захаду і далейшых магчымых мер у адказ. Акрамя таго, абмяркоўваліся беларуска-турэцкія адносіны, тэматыка саюзнага будаўніцтва з Расіяй.

Гаворачы аб прычынах ціску на Беларусь, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яны звязаны з ЗША. «Я не буду пералічваць усе прычыны, пастараюся вам назваць галоўнае. Галоўная прычына крыецца ў тым, што мы аказаліся галоўным звяном ціску ЗША і НАТА на Расію», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

У сувязі з гэтым ён нагадаў пра леташнія падзеі ў Беларусі: «Паспрабавалі Беларусь зрабіць Украінай, як яны сёння ад нас патрабуюць. Мы ім задаём пытанне: чаго вы хочаце? — Мы хочам, каб Беларусь была, як Украіна. На што я адказаў: мы Украінай быць не хочам, наш народ гэтага не хоча, і ніколі не будзем. Таму летась нас паспрабавалі праз так званую «каляровую рэвалюцыю» і мяцеж ператварыць ва Украіну. Не атрымалася».

Паводле слоў Прэзідэнта, такім чынам за кошт Беларусі хочуць поўнасцю замкнуць балта-чарнаморскі пояс і стварыць блок з мяжой на ўсходзе каля Смаленска. «Для далейшага націску і, скажу прама, прасоўвання ў Расію», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што калі не ўдаліся спробы мецяжу і наскокам зламаць краіну, тады перайшлі да планамернага націску і гібрыднай вайны. «Сутнасць гэтай гібрыднай вайны ў тым, што ідзе ціск і нападкі на Беларусь па розных напрамках з рознай інтэнсіўнасцю. Гэта выяўляецца ў ціску праз сродкі масавай інфармацыі, па дыпламатычнай лініі, палітычнай. І зараз перайшлі да жорсткага ціску па эканамічных напрамках. Пяць пакетаў санкцый супраць Беларусі ўвялі амерыканцы і еўрапейцы», — расказаў кіраўнік дзяржавы.

Закранаючы тэму міграцыйнага крызісу на беларуска-польскай граніцы, Аляксандр Лукашэнка выказаўся аб планах Польшчы пабудаваць сцяну на граніцы з Беларуссю, назваўшы гэта дурной задумай.

«Відаць, у кагосьці ў Польшчы сярод ініцыятараў гэтай сцяны скончыліся грошы. Таму яны за кошт гэтага праекта хочуць папоўніць свае кашалькі. Калі казаць пра сцяну, яна не будзе каштаваць ні 400, ні 500 мільёнаў долараў, як яны плануюць, яна будзе каштаваць каля 1 млрд долараў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што на асобных участках беларуска-польскай мяжы ўжо пабудавалі такую сцяну, але гэта не садзейнічае стрымліванню бежанцаў: «Як прызнаюць спецслужбы Польшчы, больш за ўсё бежанцаў пранікла на тых участках, дзе пабудавана гэта сцяна. Усяго каля 25 тысяч чалавек. Таму ці ёсць сэнс у такім выпадку будаваць падобную сцяну?»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб спробе пабудаваць у ЗША сцяну на граніцы з Мексікай. «Адзін прэзідэнт будаваў, другі цяпер разбурае. Думаю, што можа атрымацца так і ў Польшчы, — лічыць беларускі лідэр. — Мы не напружваемся наконт гэтага. Гэта іх праблема. Няхай будуюць. Нам горш не будзе. Але ў Польшчы вельмі нестабільная абстаноўка. І не факт, што гэты ўрад утрымаецца. І я ўпэўнены, што прыйдуць больш разумныя, гаспадарчыя людзі і знойдуць, куды патраціць гэты мільярд долараў».

Кіраўнік дзяржавы прывёў у прыклад і гісторыю разбурэння Берлінскай сцяны. «Гэта была перамога еўрапейскай дэмакратыі. Усе крычалі «не» раздзяляльным палосам і сценам на межах! Цяпер што, яны хочуць Еўрасаюз абгарадзіць сцяной пяць з паловай метраў? Неяк з ідэалогіяй і дэмакратыяй не вяжацца. Дурная, бязглуздая задума», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Нагадаем, гэта ўжо пятае інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі за паўтара месяца для замежных СМІ. Нядаўна Прэзідэнт сустракаўся з кіраўніком найбуйнейшага расійскага медыяхолдынга МІА «Россия сегодня» Дзмітрыем Кісялёвым. Да гэтага кіраўнік краіны адказаў на пытанні амерыканскай тэлекампаніі CNN, брытанскай карпарацыі ВВС, расійскага часопіса «Национальная оборона».

Марыя ДАДАЛКА.

У цэнтры ўвагі

«ДЗЯКУЙ УСІМ, ХТО НАМ ДАПАМАГАЕ ТУТ!»

Бежанцы сустрэлі Наталлю Качанаву апладысментамі

Старшыня Савета Рэспублікі пасля правядзення выязнога пасяджэння прэзідыума ў Гродне наведала пункт размяшчэння бежанцаў у ТЛЦ «Брэміна-Брузгі», дзе азнаёмілася з умовамі іх знаходжання, арганізацыяй харчавання, дзейнасцю валанцёраў і пытаннямі аказання дапамогі.

Як толькі спікер верхняй палаты парламента зайшла ў памяшканне, дзе жывуць бежанцы, тыя сустрэлі яе шчырымі апладысментамі. Наталля Качанава пагутарыла і з бежанцамі, і з тымі, хто аказвае ім дапамогу, у тым ліку з медыкамі. Яна не адмовілася ад зносін з бежанцамі. Іх праблемы выслухоўваў падчас свайго візіту і Аляксандр Лукашэнка.

Спікер Савета Рэспублікі пацікавілася ў людзей, ці ўсяго ім хапае, азнаёмілася з умовамі іх размяшчэння. Адзін з бежанцаў падчас размовы з Наталляй Качанавай выказаў словы ўдзячнасці: «Дзякуй беларускім салдатам! Дзякуй усім, хто нам дапамагае тут!»

Трэба сказаць, што больш за ўсё прыезду высокай госці радаваліся дзеці. Ад Савета Рэспублікі Наталля Іванаўна прывезла і раздала дзецям салодкія падарункі з цукеркамі ад «Камунаркі», цацкі ад фабрыкі «Палессе» і іншае.

Пасля наведвання ТЛЦ Наталля Качанава падзялілася з журналістамі эмоцыямі ад убачанага:

— Не магу глядзець спакойна ў вочы гэтых дзяцей, таму што яны па волі лёсу апынуліся ў такіх умовах. Вельмі шкада дзяцей, — кажа спікер верхняй палаты парламента. — Гэта бяда, і я ніяк не магу зразумець кіраўнікоў тых краін, якія дапускаюць такое бязладдзе.

Яна задаецца рытарычным пытаннем: што трэба, каб арганізаваць гуманітарны калідор і прапусціць людзей? Іх засталося зусім нямнога.

Спікер Савета Рэспублікі акцэнтавала ўвагу на тым, што наша краіна робіць усё, каб бежанцы, калі хочуць вярнуцца, змаглі з'ехаць дахаты. Астатніх забяспечваюць харчаваннем, ствараюць неабходныя ўмовы.

— Але гэта павінна бачыць кіраўніцтва еўрапейскіх краін, якія іх запрасілі. Паглядзіце ў вочы гэтых дзяцей, жанчын: ці нармальна ў XXI стагоддзі так здзеквацца з людзей?! — выказвае справядлівае абурэнне Наталля Качанава. — Пусціце іх туды, куды яны хочуць!

Яна паведаміла, што многія бежанцы ў размове са спікерам Савета Рэспублікі казалі, што не хочуць вяртацца дадому, а туды, куды іх запрашалі, — да сваіх родных, блізкіх, якія ўжо жывуць у Еўрасаюзе.

— З нашага боку, як члены Савета Рэспублікі, мы неаднаразова звярталіся да сусветнай супольнасці, еўрадэпутатаў, нашых калег, але нас яны не чуюць. Хоць бы сюды прыехаў адзін і паглядзеў, што адбываецца тут: глядзець у вочы гэтых людзей проста немагчыма, таму што ў іх пакуты і боль ад таго, што з імі адбываецца! — не хавае эмоцый Наталля Качанава.

На пытанне журналістаў, ці гатовы беларускі бок даць людзям больш камфортныя ўмовы для пражывання, спікер верхняй палаты нагадала:

— Мы ж прапаноўвалі больш камфортныя ўмовы: у нас былі гатовы санаторныя ўстановы, куды мы гатовы былі забраць гэтых людзей, і ў першую чаргу дзяцей і жанчын. Але яны самі тады адмаўляліся, таму што гэта далей ад граніцы, — акцэнтавала яна. — А гэтыя людзі жывуць надзеяй, што іх у найбліжэйшы час забяруць і прапусцяць туды, куды яны хочуць, — у еўрапейскія краіны. Калі хтосьці захоча знаходзіцца ў больш камфортных умовах, то ў нас такія ўстановы даўно гатовыя.

Што датычыцца магчымасці бежанцам застацца ў нашай краіне Наталля Качанава патлумачыла:

— Прэзідэнт нашай краіны заўсёды па-добраму адносіцца да людзей. Паглядзіце, колькі з Украіны ў свой час мы прынялі бежанцаў — 160 тысяч, — нагадала яна. — Толькі апошнім указам каля 500 грамадзян Украіны атрымалі грамадзянства Беларусі. Таму, калі будуць тыя, хто пажадае жыць і працаваць, я думаю, гэтае пытанне можна вырашыць.

Адзначым, што візіт членаў сенатараў сюды звязаны з даручэннем кіраўніка краіны аб кантролі за харчаваннем і медыцынскім абслугоўваннем бежанцаў у ТЛЦ. Савет Рэспублікі быў у ліку першых, хто адгукнуўся на сітуацыю, якая склалася з бежанцамі на беларуска-польскай граніцы. Наталля Качанава асабіста курыруе дзейнасць гуманітарнай місіі, якая была арганізавана з першых дзён крызісу. На месцы сітуацыю каардынавалі сенатары Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці. Да цяперашняга часу місія працягвае гэтую работу.

Вольга АНУФРЫЕВА.

❍ У ТЭМУ

Карыстаючыся магчымасцю знаходжання на граніцы, спікер верхняй палаты парламента не магла не завітаць на заставу, дзе азнаёмілася з побытам пагранічнікаў і іх службай. Асабоваму складу заставы ўручаны навагоднія падарункі ад Савета Рэспублікі.

Падчас сустрэчы членаў Савета Рэспублікі з вайскоўцамі яна расказала, што такое пажаданне было агучана падчас размовы з кіраўніком дзяржавы. Яна перадала ім падзяку ад яго імя за тое, што гэтыя смелыя хлопцы робяць для краіны і народа.

— Сітуацыя, якая разгортваецца вакол краіны, — гібрыдная вайна, і ў гэтым няма ніякага сумневу, — акцэнтавала яна ўвагу. — Усё, што адбываецца ў свеце, вельмі няпроста: ідзе геапалітычны падзел свету. Таму для нас важна захаваць суверэнітэт і краіну, у якой мы жывём сёння.

Наталля Качанава падкрэсліла: пагранічнікі сёння на перадавой.

— Вы — тыя людзі, ад службы якіх у многім залежыць мір і спакой у нашай краіне. Перш за ўсё, хлопцы, я шчыра дзякую вам за гэтую службу, Канстанцін Генадзьевіч, вам (Моластаў, начальнік Гродзенскай пагранічнай групы. — **Аўт.**), вашаму асабоваму складу і перадаю словы падзякі Прэзідэнта нашай краіны і ад усяго народа, бо вы несяце службу, якая вельмі нам сёння патрэбна.

Яна звярнула ўвагу на пераемнасць традыцый і пакаленняў пагранічнікаў:

— Вы з'яўляецеся прыкладам для той, іншай моладзі, якая жыве не думаючы, што адбываецца ў свеце ў адносінах да нашай краіны.

Са свайго боку Наталля Качанава расказала, што парламентарыі таксама прымаюць захады, каб данесці да сусветнай грамадскасці праўду.

— Справа гонару кожнага з нас — абараняць сваю краіну, вы тут — на граніцы, заканадаўцы — прымаючы рашэнні, важныя для нашай краіны і народа, — падкрэсліла яна.

Спікер верхняй палаты парламента распавяла, што дэпутацкі корпус прыняў больш чым сотню зваротаў да сусветнай супольнасці, каб голас Беларусі быў пачуты. Адным з акцэнтаў у гэтых зваротах гучыць галоўная думка: навошта вам вайна?

— Самае жахлівае, што можа быць, — гэта вайна. А мы гэта ведаем. 80 гадоў таму пачалася гэта страшэнная бяда. Няўжо мы павінны сёння здрадзіць нашаму старэйшаму пакаленню, якое адстаяла мір і свабоду? Вядома, не! — пераканана Старшыня Савета Рэспублікі. — І мы павінны зрабіць усё, каб захаваць нашу краіну.

Блізкая ўлада

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 11 снежня, з 9.00 да 12.00, правядуць:

намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васільевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Мікалаевіч ВАЛЯВАТЫ. Тэл. 8 015 273 56 44;

першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васільевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Кантэкст

Бязглуздзіца з-за акіяна

«Час вельмі складаны. І справа не толькі ў санкцыях, ціску, гібрыднай вайне, якая развязана супраць нас. Сутнасць гэтай вайны ў тым, што супраць нас ваююць у сродках масавай інфармацыі, у палітыцы, у дыпламатыі, у эканоміцы — ва ўсім. Проста падышлі да гарачай вайны», — заўважыў днямі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прымаючы кадравыя рашэнні па назначэнні кіраўнікоў мясцовай вертыкалі ўлады.

Пакуль гарачага процістаяння ўдаецца пазбегнуць, але прычыну для гэтага праціўнікі Беларусі могуць знайсці любую, упэўнены Прэзідэнт: «Няма толькі гарачай вайны. Але, можа, яны яшчэ чагосьці прыдумаюць, скарыстаўшыся, як цяперашнімі, самалётамі... Прычыну можна знайсці. І не важна, што гэтага не было. Як з самалётам. Усе прыехалі, камісія, паглядзелі. Ужо «год» мінуў пасля гэтай камісіі, а пакуль нічога не гатовы заявіць (размова аб справаздачы ІСАО па інцыдэнце з самалётам Ryanair пасля наведвання Беларусі прадстаўнікамі гэтай міжнароднай арганізацыі ў жніўні бягучага года. — **Заўв. БелТА**). Чакаюць нейкіх штуршкоў, момантаў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

І некалькі беларускі лідар меў рацыю, паказалі апошнія падзеі. Нашы, як бы гэта мякчэй сказаць, апаненты злякалі чарговы фэйк. Былы авіядыспетчар мінскага аэрапорта, які нібыта працаваў падчас інцыдэнту з самалётам Ryanair, а пасля збег у Польшчу, выклаў мясцовым уладам сваю версію таго, што адбывалася ў дыспетчарскай вышцы, паведаміла газета New York Times са спасылкай на крыніцы ў сілах бяспекі ЕС.

ДЫРЭКТАР Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Арцём Сікорскі назваў гэты матэрыял інфармацыйным укідам, паведаміла БелТА. «Інфармацыя, якая з'явілася ў New York Times, у першую чаргу разлічана на звычайнага абывацеля, на грамадскасць, на тых, хто не ведае спецыфікі грамадзянскай авіяцыі. Для нас як для прафесіяналаў гэтая інфармацыя незмястоўная і нават недарэчная. Растлумачу, чаму. Па-першае, у той дзень, 23 мая, рашэнне аб пасадцы ў Мінску прымалася камандзірам паветранага судна. Дыспетчар па ўсіх міжнародных правілах і стандартах не можа аказваць ціск на прыняцце рашэння, асабліва ва ўмовах пагрозы авіяцыйнай бяспецы, ён толькі перадае звесткі і дапамагае камандзіру паветранага судна ў бяспечнай навігацыі. «Па-другое, мы бачым, што гэты інфармацыйны ўкід ідзе ў той момант, калі мы просім ад нашых польскіх партнёраў і ад камісіі ІСАО даныя аб'ектыўнага кантролю, у прыватнасці перагаворы вільнюскага дыспетчара з пілотам і ўнутрыкабінныя перагаворы членаў экіпажа», — сказаў Арцём Сікорскі.

Паводле яго слоў, гэта неабходна, каб разумець, у чым канкрэтна беларускі бок абвінавачваюць. «Прадэманструйце, што мы аказвалі нейкі ціск, пагражалі прымяненнем баявой авіяцыі і г. д. Але гэтага няма. Мы яшчэ 24 мая поўнасцю апублікавалі ўсе перагаворы паміж пілотам і дыспетчарам, пачынаючы ад уваходу ў паветраную прастору Беларусі і заканчваючы пасадкай і зарульваннем на стаянку паветранага судна ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск». Мы для ўсіх праводзілі неабходныя брыфінгі, прэс-канферэнцыі. Нашы заходнія партнёры такой адкрытасці не праяўлялі», — адзначыў дырэктар дэпартамента.

Арцём Сікорскі пацвердзіў інфармацыю аб тым, што такі дыспетчар сапраўды працаваў у «Белаэранавігацыі». Раней ён з'ехаў з Беларусі, ніхто яму ў гэтым не перашкаджаў. «Чалавек, знаходзячыся на тэрыторыі замежнай дзяржавы, пры аказанні пэўнага ціску на яго можа пагадзіцца на тыя ці іншыя віды супрацоўніцтва, пайсці на нейкія здзелкі, у тым ліку і са сваім сумленнем. Даваць яму нейкую ацэнку я не маю права. Ён не сказаў нешта канкрэтнае. Мы бачым інтэрпрэтацыю польскімі спецслужбамі яго слоў, але не яго словы», — падкрэсліў кіраўнік ведамства.

Арцём Сікорскі расказаў, чаму зараз з'яўляюцца такія інфармацыйныя фэйкі. «Па-першае, неабходна апраўданне для аўтараў і выканаўцаў незаконных санкцый і авіяцыйнай блакады. Па-другое, трэба адвесці расследаванне куды-небудзь у бок або яго як мага даўжэй зацягнуць. Іншых прычын у іх няма, — падкрэсліў ён. — Бо для прафесіянала зразумела, што за пультам знаходзіцца не адзін дыспетчар. Ёсць дыспетчары, якія ажыццяўляюць працэдуры, радыёлакацыйны кантроль, таксама старшы дыспетчар, кіраўнік палёту. У прыватнасці, на кіраўніка палёту кладзецца вялікая адказнасць за прынятае рашэнне».

КІРАЎНІК дэпартамента акцэнтаваў увагу, што ўся неабходная інфармацыя камісіі ІСАО была прадстаўлена. «Калі прыязджала камісія ІСАО, усе нашы дыспетчары, якія ў гэты дзень былі ў змене, падрабязна расказалі, як усё адбывалася. Усё запратакаліравана. У нас ёсць усе доказы правільнасці нашых дзеянняў. У той сітуацыі ў частцы грамадзянскай авіяцыі мы дзейнічалі бездакорна, у адпаведнасці з усімі міжнароднымі стандартамі», — канстатаваў ён.

«Нам да гэтага часу незразумела, чым кіраваўся камандзір паветранага судна, калі за дзве хвіліны да пераходу граніцы паміж Беларуссю і Літвой прыняў рашэнне развярнуцца і ляцець у Мінск. Пры гэтым самалёт нават не зніжаўся на працягу ўсяго шляху накіравання ў Беларусь, хоць у стандартнай сітуацыі ён заўсёды пачынаў зніжэнне ў раёне Баранавіч для таго, каб паспець увайсці ў адпаведную пасадачную канфігурацыю.Таму ў нас таксама ёсць вельмі шмат пытанняў па гэтай сітуацыі. Трэба, каб пілот выступіў, расказаў, як ён прымаў рашэнне ў гэты момант, як дзейнічаў, з чаго зыходзіў», — адзначыў Арцём Сікорскі.

Таксама ён распавёў, на якім зараз этапе знаходзіцца расследаванне інцыдэнту з самалётам Ryanair. На працягу 224-й сесіі, якая скончылася ў лістападзе гэтага года, павінна была быць разгледжана канчатковая справаздача аб гэтым інцыдэнце. Аднак камісія ІСАО не змагла падрыхтаваць гэты дакумент, і яго разгляд перанеслі на 225-ю сесію, якая пачнецца ў сярэдзіне студзеня наступнага года і працягнецца да сакавіка. Калі і ці будуць наогул разглядаць канчатковую справаздачу, да гэтага часу ІСАО нічога не паведаміла. Мы толькі атрымалі абнадзейлівую інфармацыю, што абяцаюць падчас 225-й сесіі разгледзець нашу скаргу адносна дзеянняў заходніх краін наконт незаконнай авіяцыйнай блакады і санкцый адносна нашых перавозчыкаў. Мы неаднаразова падкрэслівалі, што нашы еўрапейскія партнёры парушаюць адпаведныя артыкулы Чыкагскай канвенцыі і па нацыянальнай прыкмеце блакіруюць палёты нашых паветраных суднаў, што з'яўляецца прамым парушэннем гэтай канвенцыі», — растлумачыў ён.

Дырэктар дэпартамента адзначыў, што цяпер вялікую актыўнасць ІСАО не праяўляе. «Апошні запыт ад іх быў недзе ў кастрычніку. З таго часу ніякай дадатковай інфармацыі яны не запыталі», — паведаміў Арцём Сікорскі.

ДАКЛАД ІСАО адкладаецца, бо няма доказаў віны Беларусі. Пра гэта ў эфіры «Альфа Радыё» заявіў старшыня праўлення беларускага таварыства «Веды» Вадзім Гігін. «Тут можна адказаць адным словам «нібыта». Нашы апаненты, калі пішуць сваю недакладную інфармацыю і запускаюць фэйкі, часта ім апелююць. Я перакананы, што польскія спецслужбы вельмі доўга працавалі, каб займець такога дыспетчара. Каб гэты «нібыта» сведка нешта паказаў. Але самае галоўнае пытанне: дзе вынікі расследавання ІСАО? Расследаванне міжнароднай арганізацыі ўвесь час адкладаецца», — адзначыў аналітык.

Паводле яго слоў, прычына пераносаў усім зразумелая: «Ніякіх доказаў віны беларускага боку няма. Другі момант — ніякіх прэтэнзій ад пасажыраў гэтага рэйса не было. Наконт тэрарыстычнай пагрозы, ніхто з іх нават не заўважыў, што адбывалася. Авіякампанія таксама не выказала дакладных прэтэнзій беларускаму боку. Якія могуць быць пытанні? Дыспетчар гэта, пасажыр, які праходзіць міма, або прыбіральшчыца, значэння не мае», — падкрэсліў Вадзім Гігін. Аналітык лічыць, што Польшча ўмешваецца ў сітуацыю, таму што яна ўзяла на сябе ролю галоўнага саперніка Беларусі.

Калі няма канкрэтыкі, то з'яўляюцца фэйкі. У сітуацыі з самалётам чарговая бязглуздзіца прыляцела з-за акіяна з падачы на ўсё гатовых польскіх сатэлітаў. Камбінацыя вядомая і разыграна па вядомых мэтах. Тут, як той казаў, нават да варажбіткі хадзіць не трэба.

Пётр ДУНЬКО.

Надвор'е

СПАЧАТКУ ПРЫМАРОЗІЛА, А ПОТЫМ — АДЛІГА

А галалёдзіца будзе амаль паўсюдна

Моцныя халады прыйшлі ў нашу краіну ўжо ў першую дэкаду снежня. Мінімальная тэмпература паветра была адзначана ў ноч на 8 снежня на метэастанцыі Езярышча і склала мінус 23,5 градуса, пры гэтым і ўдзень тэрмометры вышэй за 15 градусаў марозу тут не падымаліся, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Аднак у наступныя дні надвор'е пачне мяняцца. З тэрыторыі Украіны чакаецца зрушэнне атмасферных франтоў, за якімі ў нашу краіну будзе паступаць цёплая паветраная маса. Удзень ртутны слупок пачне паказваць плюсавыя значэнні. А гэта значыць, што ападкі будуць выпадаць у выглядзе мокрага снегу, які пераходзіць у дождж, гэта прывядзе да з'яўлення галалёдных з'яў.

Ужо ў пятніцу будзе пераважаць воблачнае надвор'е. У многіх раёнах пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, які пераходзіць у дождж. Прагназуецца галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Месцамі магчымы туман. Вецер чакаецца паўднёва-ўсходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра — ад нуля да плюс 5 градусаў, па поўначы краіны тэмпература паветра знізіцца да 2 марозу.

Канчаткова ўвесь снег адліжнае надвор'е «з'есць» ужо ў суботу. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, па паўднёвым захадзе з мокрым снегам. У асобных раёнах чакаюцца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёвай чвэрці парывісты, уначы месцамі па паўночна-ўсходняй частцы моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да плюс 5, удзень — мінус 1 — плюс 5 градусаў, па Гомельскай вобласці паветра прагрэецца да 7 цяпла.

У нядзелю на большай частцы тэрыторыі краіны будуць ісці ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі магчымыя туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер пераменных напрамкаў умераны. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла, пры праясненнях да 5 марозу. Удзень тэмпература паветра будзе ад мінус 2 градусаў да плюс 4 градусаў, па поўдні да плюс 6.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня захаваецца няўстойлівы характар надвор'я. У панядзелак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, па поўначы краіны пройдзе дождж. У асобных раёнах чакаюцца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе мінус 4 — плюс 2 градусы, удзень — ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла.

Месцамі па краіне магчымы кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу і ў аўторак. У асобных раёнах прагназуюцца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны будзе вагацца ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла. Удзень тэмпература паветра складзе ад 2 марозу да плюс 3 градусаў.

Надвор'е не палепшыцца і ў сераду. Будзе мокра (снег, мокры снег і дождж), ветрана, а таксама слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Ды і тэмпература «нязручная» — ад мінус 5 да 2 цяпла. А калі моцны парывісты вецер? Холадна, нават зусім.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

National Interest: ЗША не зацікаўленыя ў развіцці Украіны, а толькі выкарыстоўваюць яе для стрымлівання Расіі

Галоўная праблема палітыкі ЗША ў адносінах да Украіны заключаецца ў тым, што Вашынгтон зацікаўлены не ў развіцці краіны, а толькі выкарыстоўвае яе для стрымлівання Расіі. Пра гэта піша прафесар паліталогіі Род-Айлендскага ўніверсітэта Мікалай Пятро ў артыкуле, апублікаваным у часопісе The National Interest.

Такое стаўленне тармозіць мірныя намаганні па ўрэгуляванні сітуацыі ў Данбасе і прыводзіць да вялізных эканамічных страт. «Сённяшняя палітыка ЗША спараджае нездаровую залежнасць, якая ўжо перашкаджае мірным намаганням, падахвочваючы афіцыйных асоб Украіны адмаўляцца ад дыялогу з лідарамі паўстанцаў у Данбасе, і прыводзіць да вялізных эканамічных страт з-за разрыву нармальных эканамічных сувязяў з Расіяй, былым найбуйнейшым гандлёвым партнёрам краіны», — адзначыў палітолаг.

На думку эксперта, ЗША выступаюць за захаванне незалежнасці Украіны, аднак звязана гэта з імкненнем не дапусціць «аднаўлення СССР».

Новая Зеландыя мае намер стаць свабоднай ад курэння краінай

Улады Новай Зеландыі ўвядуць закон, які забароніць продаж тытуню маладому пакаленню, паведамляе партал Axios.

«Для асоб, якім на момант уступлення закона ў сілу споўніцца 14 гадоў, будзе немагчыма калі-небудзь законна купіць тытунь», — сказала намеснік кіраўніка Міністэрства аховы здароўя Айшы Верал. Паводле яе слоў, курэнне з'яўляецца асноўнай прычынай смяротнасці ў Новай Зеландыі, а рак выяўляецца ў кожнага чацвёртага курца.

Новы закон дазволіць Новай Зеландыі стаць краінай, якая зможа пазбавіцца ад тытунёвай прадукцыі цалкам.

Законапраект прадставіць у 2022 годзе ў парламенце, дзе Лейбарысцкая партыя прэм'ера краіны мае аднапартыйную большасць. Такім чынам, у наступным годзе, згодна з планам, уступіць у сілу правіла датычна ўзросту пакупнікоў цыгарэт. Таксама адзначаецца, што колькасць магазінаў, якім дазволена прадаваць цыгарэты, будзе скарочана прыкладна з 8 тысяч да менш як 500.

Кітайцы параўналі гарантыі НАТА і туалетную паперу

Чытачы кітайскага партала «Гуаньча» высмеялі і раскрытыкавалі палітыку НАТА і ЗША пасля перагавораў амерыканскага лідара Джо Байдэна з прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным.

На думку кітайцаў, заявы лідараў альянсу не заслугоўваюць ніякага даверу.

«Чым гарантыі НАТА адрозніваюцца ад туалетнай паперы? — Ад туалетнай паперы ёсць рэальная карысць!» — пажартаваў адзін з карыстальнікаў.

Як сцвярджаюць каментатары, дзеянні НАТА толькі ўмацоўваюць супрацоўніцтва Масквы і Пекіна.

Паўдзельнічаць зможа кожны!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адбудзецца традыцыйнае ўрачыстае мерапрыемства ў Палацы Рэспублікі з удзелам кіраўніка дзяржавы.

Намечаны навагодні баль для дзяцей з усіх рэгіёнаў краіны і ў Палацы Незалежнасці. На 12 студзеня запланавана правядзенне ёлкі для педагагічных работнікаў і іх дзяцей. У кожным рэгіёне пройдзе баль з удзелам кіраўніка вобласці.

Самы актыўны ўдзел у акцыі, як заўсёды, возьмуць прадстаўнікі рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады. Паводле інфармацыі **галоўнага спецыяліста ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алены СІМАКОВАЙ**, больш за 90 арганізацый, сярод якіх міністэрствы і ведамствы, канцэрны і прадпрыемствы, заявілі пра свой удзел. Іх кіраўнікі і прадстаўнікі наведаюць больш за 150 устаноў аховы здароўя, сацыяльнай абароны і адукацыі. Нагадаем, што акцыя прадугледжвае наведванне ўстаноў, дзе выхоўваюцца дзеці-сіроты, дзеці з інваліднасцю і хворыя дзеткі, якія атрымліваюць лячэнне.

— З 1995 года, калі ў краіне была аб'яўлена першая акцыя «Нашы дзеці», яна істотна змянілася. У той час каля 50 % дзяцей, якім патрабаваліся падтрымка і дапамога дзяржавы, выхоўвалася ў інтэрнатных установах, якіх у краіне было 50. На пачатак гэтага года іх засталося 11. Такім чынам, колькасць інтэрнатаў зменшылася ў нас амаль у 4 разы, а колькасць дзяцей, якія ў іх выхоўваюцца, — у 9 разоў, — прывяла лічбы Алена Сімакова. — Сёння каля 80 % дзяцей, якія засталіся без бацькоў, выхоўваюцца ў прыёмных і апякунскіх сем'ях.

Таму ўжо не першы год удзельнікі акцыі наведваюць не толькі ўстановы, але і такія сем'і. Не застануцца без увагі і дзеці, якія выхоўваюцца ў шматдзетных сем'ях, дзе пяць і больш дзяцей. У рэспубліканскіх мерапрыемствах з удзелам кіраўнікоў органаў дзяржкіравання возьме ўдзел каля 20 тысяч дзяцей, усяго ж каля мільёна малых.

— Штогод акцыя мае свае асаблівасці. Сёлетняй стане тое, што яна накіравана на ахоп усяго насельніцтва. Кожны ахвотны можа пералічыць сродкі на рахунак Беларускага дзіцячага фонду, якія пойдуць на дапамогу такім дзецям, — адзначыла Алена Сімакова. — Падвёўшы вынікі мінулагодняй акцыі, мы падлічылі, што арганізацыі і нераўнадушныя грамадзяне пералічылі на рахунку розных дзіцячых устаноў каля 3,5 мільёна рублёў — бюджэтных і пазабюджэтных. Улічваючы сёлетнюю мэту і ролю Беларускага дзіцячага фонду, мяркую, што гэта лічба будзе яшчэ большай.

Як паведаміла **начальнік аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Ганна РЫСЯВЕЦ**, сталіца таксама падрыхтавала цікавыя сюрпрызы для дзяцей у рамках акцыі. Напрыклад, 29 снежня ў Белдзяржцырку пройдзе дабрачыннае навагоднее прадстаўленне, а 30 снежня — дабрачынны навагодні баль у Палацы дзяцей і моладзі.

— Вельмі важна, каб ні адно дзіця не засталося без увагі. Больш за 56 тысяч падарункаў будзе перададзена ў сталічныя ўстановы адукацыі для дзяцей льготнай катэгорыі. Пройдзе і акцыя «Дзеці — дзецям» для тых малых, хто вымушаны правесці навагоднія святы ў бальніцах, — расказала Ганна Рысявец.

Падарункі атрымаюць і дзеці бежанцаў на беларуска-польскай граніцы.

— Сёння мы перакананыся, што беларусы не застаюцца раўнадушнымі да тых дзяцей, якія па абставінах, што ад іх не залежаць, аказаліся не дома і не ў тых умовах, у якіх ім хацелася б. Там актыўна працуюць такія грамадскія аб'яднанні, як Беларускі саюз жанчын, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, «Белая Русь». Зразумела, дзеці не застануцца без падарункаў, — паабяцала Алена Сімакова.

Алена КРАВЕЦ.

ІНАВАЦЫЙНАЕ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА І ЛІЧБАВЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ...

У ПАГОНІ ЗА КІДКАЙ НАЗВАЙ

— Штогод на кожным узроўні адукацыі ў нас адкрываецца 3–5 абсалютна новых спецыяльнасцяў. Новая — гэта тая, якая ўпершыню запраектавана і ўнесена ў класіфікатар спецыяльнасцяў і кваліфікацый, — тлумачыць **начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ**. — Па ёй, як правіла, распачынае падрыхтоўку адна ўстанова адукацыі, і толькі праз некалькі гадоў падцягваюцца іншыя. Новая спецыяльнасць адкрываецца, калі за ёй стаіць новы змест — як мінімум на 60 % адрозны ад усіх тых спецыяльнасцяў, па якіх ужо вядзецца падрыхтоўка. Пры планаванні набору абітурыентаў установы адукацыі наўпрост рэагуюць на патрэбы рынку працы. Шэраг спецыяльнасцяў перастае існаваць, таму што адсутнічае запыт на адпаведных спецыялістаў. Бываюць выпадкі, калі праз некалькі гадоў да іх зноў вяртаюцца, перапраектуюць і на аснове прынцыпу міжпрадметнасці нараджаецца нешта зусім новае і цікавае.

«У новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі, прыняцце якога мы чакаем у найбліжэйшы час, дыстанцыйная форма аддзелена ад завочнай як асобная».

Не сакрэт, што моладзь часта выбірае спецыяльнасць, арыентуючыся на моду і кідкую назву, а не на перспектывы будучага працаўладкавання. Асабліва складана вызначыцца з выбарам спецыяльнасці абітурыентам тэхнічных ВНУ.

— У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце вы абавязкова знойдзеце тыя спецыяльнасці, якія вам спадабаюцца. У нас дзейнічае 16 факультэтаў па розных напрамках: энергетыка, машынабудаванне, аўтамабіле- і трактарабудаванне, будаўніцтва, архітэктура. Мы рыхтуем кадры па 100 спецыяльнасцях і спецыялізацыях, — кажа **адказны сакратар прыёмнай камісіі БНТУ, дэкан машынабудаўнічага факультэта Андрэй САФОНАЎ**. — Але я параіў бы абітурыентам ацэньваць спецыяльнасці не толькі зыходзячы з назвы. Неабходна глядзець глыбей, вывучаць кампетэнцыі, якія атрымліваюць тыя, хто там навучаецца. Пры падрыхтоўцы павінна забяспечвацца некалькі важных умоў. У сучасным свеце адных толькі ведаў тэхнічнага характару ўжо недастаткова. Трэба ўмець яшчэ прасунуць свой прадукт (распрацоўку), прадаць яго і атрымаць прыбытак. Канцэпцыя «Універсітэта 3.0», якая рэалізоўваецца ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце, — гэта спалучэнне адукацыі, навукі і інавацыйнага прадпрымальніцтва, што непарыўна звязаны паміж сабой. Такія навыкі ў БНТУ развіваюць з дапамогай тэхнапарка «Палітэхнік». Гэта тая структура, якая акумулюе інавацыйны патэнцыял і дазваляе, падтрымліваючы стартапы, даваць і развіваць вострадэфіцытныя навыкі.

Другі вектар — практыкаарыентаванасць падрыхтоўкі. І трэці абавязковы складнік — лічбавізацыя. Тут трэба адштурхоўвацца ад сусветных тэндэнцый, комплексна прымяняць лічбавыя тэхналогіі. Я кажу аб «Індустрыі 4.0». Гэта цэлая сістэма жыццёвага цыкла любога працэсу, і яна павінна прысутнічаць і ў працэсе навучання.

— Акрамя зместу адукацыі, яго аб'ёму і структуры, вельмі важна, як мы вучым моладзь тым ведам, навыкам і ўменням, якія, з нашага пункту гледжання, павінны быць у будучых спецыялістаў, — разважае Сяргей Каспяровіч. — Трэба разумець, што моладзь сёння іншая, у інтэрнэце прысутнічаюць невычэрпныя аб'ёмы інфармацыі. Каналы ўспрымання інфармацыі змяніліся, таму і спосабы яе атрымання павінны быць іншыя. Прыярытэт мы бачым у сучасных змешаных метадах навучання з выкарыстаннем ІТ-тэхналогій. Але самае галоўнае, каб падчас адукацыйнага працэсу ініцыіравалася пазнавальная актыўнасць моладзі, павышалася матывацыя да атрымання ведаў. А гэта тэхналогіі, звязаныя з праектнымі метадамі, дзелавыя гульні... Традыцыйная для вышэйшай школы вочная лекцыйная сістэма навучання ўжо не такая эфектыўная, як раней.

ДЫСТАНЦЫЙНЫ АНЛАЙН-ФАРМАТ

А вось адмаўляцца ад завочнай формы навучання ў Беларусі не плануюць.

«Магу сказаць, што завочная форма адукацыі, якая з'яўляецца класічнай, традыцыйнай, захаваецца. Гэта не нейкая спадчына, што засталася ад ранейшых часоў. Такая форма, з майго пункту гледжання, павінна быць запатрабаваная ў дарослага чалавека, які рэалізаваў сябе, ужо працуе ў пэўнай сферы і жадае атрымаць вышэйшую адукацыю», — падкрэсліў Сяргей Каспяровіч.

Паводле яго слоў, завочная форма патрабуе большай самастойнасці і матываванасці да навучання: «Што такое завочная форма? Тры — чатыры месяцы чалавек працуе сам у рэжыме толькі асобных кансультацый з выкладчыкамі. А на сесію на тры тыдні прыязджае і павінен здаць іспыты і залікі. Аб'ёмы падрыхтоўкі на завочнай форме скарачаюцца ў нашых ВНУ ў апошнія гады вельмі істотна, але яна ўсё роўна захаваецца. У пэўнай ступені на змену ёй прыйдзе дыстанцыйная форма, якая па сваёй сутнасці іншая. Яна нават больш падобная на дзённую. Гэта проста дыстанцыйны анлайн-фармат, калі выкладчык і студэнт знаходзяцца не побач, а ў розных месцах. А наогул, адбываецца штодзённая праца ва ўзаемадзеянні з выкладчыкамі толькі на адлегласці, праз ІКТ-тэхналогіі. І ў новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі, прыняцце якога мы чакаем у найбліжэйшы час, дыстанцыйная форма аддзелена ад завочнай як асобная. У нас будуць фактычна тры формы навучання: вочная, дыстанцыйная і завочная», — патлумачыў начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі.

Фота Яўгена ПРОСЕЦКАГА.

Дарэчы, калі гаварыць аб «Універсітэце 3.0», то гэты праект актыўна рэалізоўваецца ў вядучых ВНУ. Яго асноўная задача — не толькі стымуляваць навуковыя даследаванні, але і фарміраваць новае пакаленне моладзі, якое само можа генерыраваць стартапы, ствараць новыя прадукты, новыя тэхналогіі і іх камерцыялізаваць. У гэты праект актыўна ўключылася больш за дзясятак універсітэтаў...

Сяргей Каспяровіч акцэнтаваў увагу і на карэкціроўцы зместу адукацыі. «Існуе пэўны стэрэатып у грамадстве: маўляў, запраектавалі, адкрылі спецыяльнасць, вядуць на ёй падрыхтоўку 5—10 гадоў, і за гэты час там нічога не змянілася — фактычна рыхтуюць кадры ўчарашняга дня. Гэта абсалютна няправільны пасыл і няправільнае ўспрыманне рэальнасці, таму што любая спецыяльнасць нават за год перажывае шмат змен, — запэўнівае Сяргей Каспяровіч. — І нават набор папярэдняга і наступнага года на адну і тую ж спецыяльнасць можа сутыкнуцца з зусім розным зместам адукацыі. Для гэтага неабавязкова мяняць вучэбны план або адукацыйны стандарт — дастаткова ўносіць змены ў змест асобных вучэбных дысцыплін. Усё гэта будзе праецыравацца на тое, што мы будзем рыхтаваць ужо іншага спецыяліста, які адпавядае будучым патрэбам эканомікі. Але заказчык кадраў павінен дакладна фармуляваць патрабаванні, што хоча прад'явіць будучаму работніку».

ТУРБУЛЕНТНЫ ЧАС

— Выключна тэарэтычная падрыхтоўка не патрэбная сёння ўжо нават на гуманітарных спецыяльнасцях, — падзяляе думку калег **прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі БДУ Канстанцін КАЗАДАЕЎ**. — Работадаўцы становяцца ўсё больш патрабавальнымі да наяўнасці ў нашых студэнтаў практычных навыкаў, хочуць, каб тыя ўжо мелі нейкія напрацоўкі, рэалізаваныя праекты ў сваіх прадметных абласцях. Сёння да кваліфікаванага спецыяліста прад'яўляюцца патрабаванні глабальнага характару, якія выяўляюцца ў шырокай інтэграцыі гуманітарных, сацыяльных і тэхналагічных ведаў і кампетэнцый.

Увогуле, адно з галоўных патрабаванняў да спецыяліста будучыні — наяўнасць у яго міждысцыплінарных навыкаў, бо ўсе адкрыцці цяпер робяцца на стыку навук. Прафесіяналы такога ўзроўню больш мабільныя, яны арыентуюцца ў некалькіх абласцях ведаў, бачаць задачу з розных бакоў і здольныя да вырашэння глабальных праблем. Для вышэйшай школы падрыхтоўка канкурэнтаздольных выпускнікоў з міждысцыплінарнымі ведамі і ўніверсальнымі кампетэнцыямі — сапраўдны выклік.

Для рынку працы сёння ўласцівая хуткая зменлівасць і нестабільнасць. Спецыяліста на першай ступені вышэйшай адукацыі рыхтуюць чатыры гады, а за гэты час і сама спецыяльнасць, і веды, якія атрымлівае студэнт, могуць страціць актуальнасць. Таму важна быць мабільнымі і ўмець хутка адаптавацца. Турбулентны час патрабуе новых падыходаў...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Сёлета ў беларускіх ВНУ з'явілася некалькі новых спецыяльнасцяў. У БДУ — «Рэгіёназнаўства» на гістарычным факультэце і «Эканамічная бяспека» — на эканамічным. Апошняя інтэгравала найлепшыя айчынныя праграмы па эканоміцы, праве і інфармацыйных тэхналогіях у сферы бяспекі. Адкрыццё спецыяльнасці «Рэгіёназнаўства» было абумоўлена запатрабаванасцю айчынных арганізацый і кампаній у супрацоўніках, якія валодаюць комплекснымі ведамі аб палітычных, эканамічных, сацыяльных, экалагічных, канфесійных, этнічных і культурных асаблівасцях пэўнага рэгіёна.

У Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі адбыўся першы набор на спецыяльнасць «Лётная эксплуатацыя паветраных суднаў грамадзянскай авіяцыі» з прысваенням выпускнікам кваліфікацыі «Інжынер-пілот». У БНТУ — спецыяльнасці «Інавацыйная тэхніка для будаўніцтва комплексу» са спецыялізацыямі і «Прамысловы дызайн» — з двума кірункамі: дызайн транспартных сродкаў і дызайн прамысловага абсталявання.

А з наступнага года ў БДУ пачнуць рыхтаваць спецыялістаў па турызме з міждысцыплінарнымі ведамі. Новая спецыяльнасць «Геатэхналогіі турызму і экскурсійная дзейнасць» з'явіцца на факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ. Акрамя класічных геаграфічных дысцыплін, студэнты атрымаюць комплексныя веды ў галіне геатэхналогій і ГІС-тэхналогій, якія ўключаюць web-праграмаванне і праектаванне, галіновыя геаінфармацыйныя сістэмы, прагнозную аналітыку і рэкламу ў турысцкай галіне, эканоміку турызму і інш. Яе адкрыццё абумоўлена патрэбай айчынных арганізацый у супрацоўніках з веданнем сучаснага турызму ва ўмовах глабалізацыі, інфарматызацыі і лічбавізацыі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ажурны цуд Наталлі Бярнадскай

Калі глядзіш на вокны, упрыгожаныя выцінанкай, адразу ж з'яўляецца навагодні настрой. І хочацца зрабіць такую ж казку і для сябе. Дапамагчы ў гэтым пагадзілася народны майстар з Крычава Наталля БЯРНАДСКАЯ. На сустрэчу яна прыйшла з поўным камплектам сняжынак, ёлачак і нават сімвалам года тыграм. Прызналася, што менавіта гэты варыянт распрацавала спецыяльна для чытачоў «Звязды». Ён менш складаны і якраз разлічаны на навічкоў. Калі цікава, запрашаем на майстар-клас ад спецыяліста.

Ажурныя карціны.

БАБУЛІНЫ ЎРОКІ

Першую сваю сняжынку з паперы Наталля выразала яшчэ ў дзяцінстве пад кіраўніцтвам бабулі. Гэтага было дастаткова, каб зацікавіцца народнай творчасцю. Зараз яна выразае з паперы нават ручнікі. Бабуля іх вышывала ніткамі, а ўнучка стварае народныя сімвалы нажніцамі. Ды так прыгожа, што папяровы ручнік здаецца не менш цікавым, чым з тканіны. Бабуля ўжо пайшла з жыцця, але Наталля з удзячнасцю ўспамінае яе ўрокі.

— Яна вучыла мяне ўсяму, што сама ўмела: вышываць, вязаць, выразаць, — расказвае майстар. — Бабуля з дзядулем жылі ў вёсцы Горкі, што за 30 кіламетраў ад Крычава. Дагэтуль у памяці іх утульны дамок, дзе я праводзіла амаль усе свае канікулы. Дзядуля плёў кошыкі, а бабуля займалася жаночымі рамёствамі. Мне было цікава назіраць за тым, што яна робіць, і паўтараць.

Ручнік ад Наталлі БЯРНАДСКАЙ.

Цяжэй было навучыцца майстраваць павукоў з саломы, якіх рабіла бабуля, але потым вучаніца перасягнула настаўніка. Калі вучылася ў Магілёўскім вучылішчы культуры, даведалася шмат чаго новага. Бабуля адвяла ёй на агародзе кавалачак зямлі, дзе ўнучка вырошчвала «салому» для сувеніраў. Але выцінанка па-ранейшаму — яе самае вялікае захапленне. Успамінае, што, назіраючы за бабулінымі рукамі, старалася паўтарыць на паперы арнамент, які тая вышывала. Больш глыбока Наталля вывучала яго падчас вучобы ў вучылішчы, а потым у Мінскім універсітэце культуры і мастацтваў.

Цяпер перадае свой вопыт выхаванцам Крычаўскай дзіцячай школы мастацтваў. Чыста выцінанкай займаецца некалькі чалавек, а астатнім яна расказвае пра яе на занятках па асновах выяўленчага мастацтва. Удасканальвацца ім дапамагаюць конкурсы. У апошнім усерасійскім вучні Наталлі Бярнадскай былі адзначаны прызавымі дыпломамі. Сама яна таксама актыўна ўдзельнічае ў розных конкурсах, майстар-класах, фестывалях. Менавіта гэта дае майстру трымаць сябе ў форме. Яе работы пазнавальныя і ацэньваюцца вельмі высока. Але паранейшаму як самы дарагі ўспамін пра сваё дзяцінства і бабулю захоўвае саматкану ручнік з узорам «крыніца» і абрус з вышытымі па краях узорамі. Апошні, смяецца, на ўсіх фестывалях замежнікі спрабуюць купіць.

ЯК ЗАХАПЛЕННЕ СТАЛА ПРАФЕСІЯЙ

Сёлета Наталля Бярнадская стала народным майстрам, яе выцінанкі былі ўключаны ў элемент народнай спадчыны Беларусі. Усяго ў краіне 11 такіх майстроў. Каб атрымаць гаваровы статус, трэба прытрымлівацца народных традыцый і перадаваць іх, ведаць тэхналогію выразання выцінанкі, яе гісторыю. У кожнай вобласці ёсць свае адрозненні, свае традыцыі. Наталля, напрыклад, любіць выразаць рознакаляровую выцінанку, шматслойную і больш ажурную.

— Наогул, гісторыя з'яўлення выцінанкі вельмі даўняя, з XVI стагоддзя. Калі папера была дарагой, выцінанка лічылася забавай пераважна для заможных, — расказвае суразмоўніца. — Быў перыяд, калі захапляліся выразаннем сілуэтаў (яна так і называецца — сілуэтная выцінанка). А ў савецкі час сапраўды бум на выцінанку адбыўся пасля вайны. У людзей грошай на цацкі не было, а атмасферу стварыць хацелася. Вось нашы бабулі і эксперыментавалі з паперай. Рабілі ўпрыгожванні на ёлку і акенцы. Нехта рабіў фіранкі, нехта — сняжынкі. Выразалі ручнікі, стужкі для упрыгожвання палічак, абрамлялі іконы і фотаздымкі.

Апошнім часам таксама назіраецца ўздым цікавасці да выцінанкі, яна становіцца прадметам для калекцый. Наталля з захапленнем расказвае пра міжнародныя форумы, куды з'язджаюцца выцінаншчыкі з усяго свету. Там можна ўбачыць шмат чаго незвычайнага.

— Кітайцы наогул выразаюць яе з рысавай паперы, выцінанка ў іх вельмі тонкая, — адзначае Наталля. — У Мінску аднойчы была выстаўка кітайскай выцінанкі. Я хадзіла, адкрыўшы рот, і фатаграфавала. Кітайцы давалі майстар-клас, але тонкасці не вельмі раскрывалі.

Наталля таксама калекцыніруе выцінанку. Прызнаецца, што пакуль яе калекцыя невялічкая. Самыя прыгожыя ў ёй работы кітайскіх і літоўскіх майстроў. У апошніх яны танюткія, як павуцінкі.

Работы Наталлі Бярнадскай таксама запатрабаваныя. Яны ёсць у прыватных калекцыях, установах культуры вобласці і нават краіны, напрыклад, у Нацыянальным інстытуце культуры. А прыгажосць у сценах Крычаўскай дзіцячай школы мастацтваў яна наводзіць рэгулярна.

— Аднойчы нас з калегам папрасілі ўпрыгожыць выцінанкай цэнтральны ўваход школы, — успамінае яна. — Я выразала Снягурку і ўпрыгожыла яе спадніцу мноствам ажурных сняжынак.

Ёсць аматары выцінанкі, якія скупляюць работы майстрых оптам. Каб падоўжыць век паперы, некаторыя ламініруюць свае ажурныя сурвэткі і сняжынкі, робяць з іх падстаўкі пад кубкі або закладкі для кніг. Нехта ўпрыгожвае імі інтэр'ер, а некаторыя — нават адзенне. Як народны майстар з Маладзечна Лізавета Чырвонцава, якая зрабіла сабе касцюм з задэкараваннай пад яе выцінанку тканіны.

Сняжынка сваімі рукамі.

ВЫБІВАНКА, ВЫРЫВАНКА, ВЫСТРЫГАНКА, А ПРАСЦЕЙ КАЖУЧЫ — КАРПІНЯ

Гэта ўсё назвы тэхнік, па сутнасці, аднаго і таго ж мастацтва — выцінанкі. Назву карпіня яна атрымала ад дзеяслова «карпець», бо для таго, каб ёй займацца, трэба быць уседлівым.

— Пад Мінскам нават вёска ёсць — Карпілаўка, напэўна, былая сталіца выцінаншчыкаў, — усміхаецца Наталля.

Адрадзіў у Беларусі выцінанку Вячаслаў Дубінка ў 1980-я гады. Дзякуючы такім захопленым людзям, як ён, у краіне захаваліся вельмі рэдкія тэхнікі стварэння папяровых узораў. Яны прызнаныя матэрыяльнай каштоўнасцю краіны. Тая ж Наталля Клімко з Навагрудчыны адраджае традыцыйнае мастацтва выцінанкі-выбівання. Яшчэ адна майстрыха — Вольга Бабурына — валодае тонкасцямі стварэння выцінанкі-вырыванкі. На адным з майстар-класаў яна прызнавалася, што ў дзяцінстве бацькі баяліся даваць ёй у рукі нажніцы, і яна вырывала будучае ўпрыгожванне па контуры. Такім жа чынам потым рабіла ўзоры ўнутры.

— Наогул, выцінанка — цэлы сусвет, — з захапленнем кажа Наталля. — Я ўжо 20 гадоў ёй сур'ёзна займаюся, а ўсё не перастаю рабіць адкрыцці. У Беларусі існуе выцінанка рапортная (тыя ж фіранкі, дзе папера складваецца гармонікам), люстэркавая або сіметрычная (калі папера складаецца папалам і нешта выразаецца) і разеткавая (папера складваецца такім чынам, каб грані сіметрычна скрыжоўваліся ў цэнтры — накшталт сняжынкі). У тых жа кітайцаў такіх складанняў наогул няма. Яны малююць сілуэт, наносяць алоўкам узоры і выразаюць макетным нажом або выбіваюць фігурнымі трубачкамі з завостранымі краямі.

Ад работ Наталлі таксама не адвесці вачэй. Узяць, напрыклад, той жа ручнік. Уявіце сабе палатно з паперы даўжынёй паўтара метра, шырынёй — амаль паўметра!

— Вельмі спяшалася, але ўсё роўна рабіла тры тыдні, — расказвае майстрыха. — Была вялікая колькасць складанняў, шмат і вельмі асцярожна прыходзілася выразаць узоры. Калі рыхтуешся да якой-небудзь выставы або фестывалю, працуеш тыднямі, амаль не падымаючы галавы. Бывае, нават і спіш усяго некалькі гадзін.

ПАДАРЫЦЕ ТЫГРА

Калі збіраецеся ўпрыгожыць свае вокны да Новага года, трэба пачынаць ужо зараз. Гэта робіцца не так хутка, як вы думаеце. Асабліва калі ёсць жаданне стварыць нешта эксклюзіўнае.

Выцінанка, напэўна, — самы малабюджэтны від мастацтва. Для заняткаў ёй дастаткова стала, вялікіх і маленькіх нажніц, а таксама макетнага нажа. Яго не праблема знайсці ў канцтаварах або ў крамах для мастакоў.

Упрыгожыць ёлку можна фіранкамі і сняжынкамі. Падгледзець што-небудзь цікавае не грэх і ў інтэрнэце.

— Вось такую ёлку можна выразаць за дзень-два, — дэманструе карцінку ў сваім мабільным тэлефоне Наталля. — Складваецца кожная грань і выразаецца па цэнтры і ад краю. А вось такія сняжынкі можна зрабіць пры дапамозе макетнага нажа.

Наталля бярэ нажніцы ў рукі і пачынае паказваць. «Па контуры абразаю вялікімі нажніцамі, а вось узор раблю маленькімі», — звяртае яна ўвагу.

Майструе нешта накшталт самалёціка, каб сышліся грані, і абразае. Потым бярэцца за ўзор. Яго можна папярэдне намаляваць або выразаць наўгад. Усё роўна нешта цікавае атрымаецца.

— Вельмі прыгожа выглядае аб'ёмная выцінанка — елкі, анёлы, шары, — расказвае Наталля. — Можна аб'ёмную сняжынку прыдумаць, зорачкі. Сабе выразаю на Новы год аб'ёмную ёлку. Унутры стаўлю святлодыёдную лямпачку. Прыгожа, словамі не перадаць.

Сёлета Наталля Бярнадская стала народным майстрам, яе выцінанкі былі ўключаны ў элемент народнай спадчыны Беларусі.

Аб'ёмная выцінанка, удакладняе майстрыха, выразаецца з больш шчыльнай паперы.

— Асноўны малюнак выцінанкі — гэта прырода або народны арнамент, — кажа яна. — Звычайна мы з дзеткамі робім эскіз, каб было зразумела, што выразаць. Чым больш слаёў, тым прыгажэй атрымліваецца работа. Самае цікавае, што, калі выразаеш, а потым раскрываеш, бачыш узор, пра які нават і не думаў. Зараз у нас з дзецьмі ў школе мастацтваў асноўны ўзор — тыгр. Яно і зразумела: гаспадар новага года. Робім шаблоны і выразаем, хто на што здольны. У нас у кабінеце тры вялікія акны, так што ёсць, дзе разгуляцца фантазіі.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
г. Крычаў.

Фота аўтара, эскізы Наталлі БЯРНАДСКАЙ.

Асцярожнасць — перш за ўсё

Зіма сёлета, як заўважылі многія, наступіла згодна з календаром. Выпала даволі шмат снегу, мароз з кожным днём мацнее. Аднак ці гатовыя да такога надвор'я, а таксама яго наступстваў людзі? Пра гэта падчас прэс-канферэнцыі на тэму «Асаблівасці работы ратавальнікаў у зімовы перыяд» пагаварылі спецыялісты, якія яшчэ раз нагадалі аб правілах бяспекі зімой, калі рызыка трапіць у надзвычайную сітуацыю ўзрастае.

Начальнік Мінскай гарадской ратавальнай станцыі «Камсамольскае возера» Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага грамадскага таварыства ратавання на водах Дзяніс ЧАШУН заклікаў грамадзян не выходзіць на неакрэплы лёд. «У хуткім часе мы чакаем наплыў рыбакоў, — паведаміў ён. — Штогод ім даводзіцца інфармаваць аб тым, што выхад на ваду ў пачатку зімы небяспечны, бо лёд яшчэ не стаў моцны. Акрамя таго, каля вадаёмаў мы часта сустракаем дзяцей без суправаджэння дарослых, што таксама можа прывесці да сумных наступстваў».

— Таварыства ратавання на водах штотыднёва размяшчае на сваіх рэсурсах інфармацыю аб таўшчыні лёду, а таксама аб абставінах, якія могуць накладваць абмежаванні на выхад на ваду, — расказаў начальнік станцыі «Камсамольскае возера». — Калі вы ўбачылі, што чалавек праваліўся пад лёд, неадкладна паведаміце аб гэтым па тэлефону 101 або 112. Прафесійныя ратавальнікі прыедуць на месца і будуць гатовыя да любой сітуацыі. Добра, калі чалавек праяўляе гераізм, але трэба ведаць меру. Часцей за ўсё мы выязджаем на ратаванне аднаго чалавека, а ў выніку даводзіцца ратаваць некалькіх. Не варта пераацэньваць свае сілы.

Забараняецца выходзіць на лёд падчас ледаставу, да дасягнення таўшчыні лёду сямі сантыметраў, а таксама ў перыяд інтэнсіўнага раставання і разбурэння лёду. Падчас падлёднай рыбалкі не рэкамендуецца прабіваць шмат лунак на блізкай адлегласці, скакаць і бегаць па лёдзе, збірацца вялікімі групамі. Кожнаму рыбаку пры выхадзе на падлёдную рыбалку варта ўзяць з сабой выратавальную камізэльку і вяроўку даўжынёй 15—20 метраў з пятлёй на адным канцы і грузам (вагой 400—500 грамаў) на другім.

Ратавальнікі рэкамендуюць: калі вы праваліліся пад лёд, трэба дзейнічаць хутка і рашуча. Калі пацярпелы не змог самастойна выбрацца з вады і да яго прыбыла падмога, падчас ратавання варта выкарыстоўваць лесвіцы, дошкі, жэрдкі, вяроўкі і іншыя падручныя сродкі шляхам іх падачы таму, хто праваліўся пад лёд. Пры гэтым набліжацца да пацярпелага варта лежачы або паўзком, пажадана — абапіраючыся на прадметы, якія павялічваюць плошчу апоры. Калі ратавальнікаў двое ці больш, лепш утварыць ланцужок, утрымліваючы адзін аднаго за ногі.

Начальнік галоўнага ўпраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Дзмітрый ТУРЧЫН акцэнтаваў увагу на эксплуатацыі печаў у зімовы перыяд, а таксама падкрэсліў, што цяпер найбольш небяспечны час для пажараў. «За 11 месяцаў бягучага года ў стане алкагольнага ап'янення знаходзілася 325 загінулых падчас пажараў людзей (гэта 55 % ад усіх загінулых з гэтай прычыны ў краіне), — адзначыў прадстаўнік МНС. — Неасцярожнасць пры курэнні прывяла да гібелі 374 чалавек (63,5 % ад агульнай колькасці загінулых на пажарах)».

Павелічэнне ў зімовы перыяд зваротаў насельніцтва ў службу хуткай дапамогі адзначыў **загадчык падстанцыі № 11 Гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Яўген ЮДАКОЎ.** «Гэта звязана як з сезоннымі прастуднымі захворваннямі, вірусам грыпу, а апошнім часам і з каранавіруснай інфекцыяй, часцей узнікаюць галалёдныя траўмы, — канстатаваў урач хуткай медыцынскай дапамогі. — Апошнім часам абвастрылася праблема дзіцячага траўматызму пры катанні на цюбінгах у неабсталяваных для гэтага месцах. Звяртаюся да бацькоў: не пакідайце сваіх дзяцей без нагляду і не дазваляйце катацца на цюбінгах там, дзе для гэтага не створана адпаведных умоў!»

Прадстаўнік аховы здароўя паведаміў, што ўсё часцей па медыцынскую дапамогу звяртаюцца з нагоды пераахаладжэння. «Як правіла, пацярпелыя ў асноўным знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення, — падкрэсліў урач. — Ёсць памылковае меркаванне, што, ужываючы алкаголь, можна сагрэцца. Гэта абсалютна не так! Алкаголь выклікае ўяўнае адчуванне цяпла, пры гэтым, наадварот, узмацняецца цепладдача, і пераахаладжэнне, у тым ліку гібель, наступіць ад холаду нашмат хутчэй, чым у чалавека, які алкагольныя напоі не ўжываў».

Вераніка КАНЮТА.

Навінкі кнігарні



Колькі колераў у лета?..

Генадзь Аўласенка — вядомы беларускі паэт і празаік, які шмат піша і для дзіцячага чытача. Творы літаратара пастаянна друкуюцца ў дзіцячых часопісах «Вясёлка», «Буся», «Бярозка», «Качели», «Весёлый зоопарк», у розных калектыўных зборніках. І таму не дзіўна, што кнігі Генадзя Аўласенкі хутка разыходзяцца з паліц кнігарняў і не залежваюцца ў выдавецтве. І часам перавыдаюцца. Як, напрыклад, зборнічак вясёлых і цікавых, пазнавальных вершаў «Зайка польку танцаваў», які толькі што ўбачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда». Першае выданне кнігі было здзейснена ў 2016 годзе.

«Зайка польку танцаваў: / Чаравічкі сапсаваў. / Вось як Зайку не шанцуе! / Зайка болей не танцуе. / Ён цяпер сядзіць, бядуе... / Можа, хто і пашкадуе? / Можа, купіць чаравічкі, / Чаравічкі-невялічкі...» Вершы Генадзя Аўласенкі напоўнены фантазіяй, гумарам... *«Я скажу вам без маны: / У мяне жывуць слоны! / Я кармлю іх салам з хлебам... / Што? Не верыце? / Не трэба!» («Фантазёр»). «Табурэт да табурэта — / Атрымалася... ракета!» («Касманаўт»).*

Выдадзеная накладам 1000 асобнікаў, кніга дзіцячых вершаў і загадак «Зайка польку танцаваў» Генадзя Аўласенкі ўжо прыйшла ў кнігарні. Набыць зборнік можна і ў «Акадэмкнізе» ў Мінску па адрасе: Мінск, праспект Незалежнасці, 72. Некаторыя з асобнікаў кнігі пісьменнік падпісаў сваім юным чытачам. Чым не падарунак?!

Мікола БЕРЛЕЖ.

Беларуская эстрада займела сваю «энцыклапедыю»

Іначай як сапраўдным энцыклапедычным даведнікам работу вядомай беларускай музыказнаўцы Вольгі БРЫЛОН «Беларуская эстрада. Настальгічны дывертысмент» і не назавеш.

Кніга, якая толькі што ўбачыла свет, ураджвае сваімі памерамі. Нават задумваешся, ці пад сілу было тое зрабіць аднаму чалавеку — сабраць столькі інфармацыі, знайсці мноства фотаздымкаў, рознага характару дакументаў, архіўных матэрыялаў. Вольга Брылон справілася з гэтым клопатам на высокім узроўні. Няма ніякіх сумненняў, што кніга выкліча цікавасць і ў чытачоў-спецыялістаў, і ва ўсіх, хто нераўнадушны да гісторыі беларускай эстрады.

14 снежня а 17-й гадзіне ў «Акадэмкнізе» ў Мінску па адрасе: праспект Незалежнасці, 72 пройдзе прэзентацыя выдання Вольгі Брылон «Беларуская эстрада. Настальгічны дывертысмент. Гісторыя эстрады Беларускай дзяржаўнай філармоніі: 1930—1980-я гады». Сярод ганаровых гасцей імпрэзы — сузасланальнік ВІА «Песняры» Уладзіміра Мулявіна, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Уладзіслаў Місевіч, а таксама — старэйшая дачка «песняра» Марына Мулявіна. Пастарайцеся наведацца на прэзентацыю — і вы будзеце мець магчымасць не толькі ўбачыць кнігу, пагартаць яе, але і набыць з аўтографам аўтара.

Сяргей ШЫЧКО.

ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,

***опубликованную в газете «Звязда» от** 05.08.2021 **№** 148 (29517) **с дополнением от** 10.08.2021 **№** 151 (29520), **от** 02.10.2021 **№** 190 (29559), **от** 27.10.2021 **№** 207 (29576), **от** 13.11.2021 **№** 220 (29589)*

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика).

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 № 148 (29517), следующие дополнения:

Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:

- 1 (одна) трехкомнатная квартира № 80 (проектный) общей площадью по проекту 91,4 кв. метров на 3-м этаже 3-й секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1500 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежа составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1600 долларам США;

- 1 (одна) однокомнатная квартира № 174 (проектный) общей площадью по проекту 36,9 кв. метров на 8-м этаже 4-й секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1550 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежа составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1600 долларам США.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Оплата первоначального взноса осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть, в том числе при 100 % оплате цены договора, оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляется не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации в порядке очередности обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с предоставлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное жилое помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375(17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.

ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,

***опубликованную в газете «Звязда» от** 23.12.2020 **№** 250 (29364) **с дополнением и изменением от** 01.07.2021 **№** 123 (29492), **от** 04.08.2021 **№** 147 (29516), **от** 11.09.2021 **№** 175 (29544), **от** 02.10.2021 **№** 190 (29559)*

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства машино-мест в гараж-стоянке, расположенной в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник-пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 23.12.2020 № 250 (29364) с дополнением и изменением от 01.07.2021 № 123 (29492), от 04.08.2021 № 147 (29516), от 11.09.2021 №175 (29544), следующие дополнения:

Сведения о количестве объектов долевого строительства (машино-мест), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:

1 (одно) машино-место № 47 общей площадью по проекту 21,50 кв. метров, расположенное на 1 подземном уровне гараж-стоянки. Стоимость машино-места составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 11 000 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежа составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 12 000 долларам США.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Оплата первоначального взноса осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть, в том числе при 100 % оплате цены договора, оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляется не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации в порядке очередности обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с предоставлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное жилое помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375(17) 392-20-45 (46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
10 снежня 2021 г. № 48 (633)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Рамана КЛОЧЬКА.

АЙЧЫННАЙ АГАРОДНІНЫ ХОПІЦЬ ДА САМАГА ЛЕТА

Тры тысячы тон бульбы, 950 тон капусты, 400 тон буракоў, 550 тон морквы, па 800 тон цыбулі і яблыкаў чакаюць сваёй рэалізацыі

Аб'ёмы стабілізацыйных фондаў на міжсезонны перыяд і ўмовы захоўвання і рэалізацыі агародніны, бульбы і яблыкаў ацанілі сёння Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА (як упаўнаважаная Прэзідэнта па горадзе Мінску) і мэр сталіцы Уладзімір КУХАРАЎ.

Як растлумачыў **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Юрый ТРУШЧАНКА,** аб'ём стабілізацыйнага фонду сталіцы сёлета быў павялічаны ў некалькі разоў у параўнанні з мінулым годам, бо летась усе запасы былі рэалізаваны заўчасна і нічога не засталося.

— Аб'ёмы, даведзеныя Мінгарвыканкамам, у 4-5 разоў большыя, чым на УП «Партызанскае», — кажа ён. — Гэта звязана з тым, што частка захоўваецца ў агульнагарадскіх сховішчах стабфондаў, а частка — па дагаворах з суб'ектамі гаспадарання, рознымі рытэйлерскімі кампаніямі, буйнымі гандлёвымі сеткамі.

Менавіта тут, на «Партызанскім», і ацанілі запасы для мінчан кіраўнікі заканадаўчай і выканаўчай улады. Дарэчы, не першы год запасы пладова-агароднінаў прадукцыі ад вытворцаў з розных рэгіёнаў закладваюцца ў сховішчы прадпрыемства, што ў Калядзічах. Сёлета тут назапашана тры тысячы тон бульбы, 950 тон капусты, 400 тон буракоў, 550 тон морквы, па 800 тон цыбулі і яблыкаў.

Як расказалі на прадпрыемстве, у сховішчы падтрымліваюцца неабходныя ўмовы (тэмпературны рэжым і вільготнасць), каб увесь перыяд захоўвання і рэалізацыі (а гэта да канца вясны — 31 мая 2022 года) агародніна і садавіна не страчвалі свае таварныя ўласцівасці, а пакупнікі (арганізацыі бюджэтнай сферы, прадпрыемствы грамадскага харчавання і гандлю сталіцы) маглі задаволіць свае патрэбы.

Генеральны дырэктар УП «Партызанскае» Таццяна КУЗАЎЛЁВА расказала, што ўжо сфарміраваны адпускныя цэны на прадукцыю, што захоўваецца. Прайсы з камерцыйнымі прапановамі ўжо адпраўлены гандлёвым сеткам. Хтосьці нават паспеў імі скарыстацца — у сталічным гандлі дзе-нідзе ўжо можна знайсці айчынныя бульбу, яблычкі і іншую агародніну.

Юрый Трушчанка запэўнівае: цяпер ніякіх праблем са стабілізацыйнымі фондамі няма, сталіца будзе забяспечана пладова-агароднінай прадукцыяй у міжсезонне аж да пачатку лета.

— Запасы размяркоўваюцца для раўнамернага расходавання да 31 мая ў адпаведнасці з графікам у гандлёвыя сеткі і аб'екты сацыяльнай сферы — дзіцячыя садкі і школы, бальніцы, дамы-інтэрнаты, — адзначыў ён.

Намеснік старшыні гарвыканкама паведаміў, што пакуль адгрузка ідзе пераважна ў рознічныя гандлёвыя сеткі, таму што ў сацыяльных устаноў ёсць свае пастаўшчыкі, якія выйгралі таргі. Таксама ён звярнуў увагу, што на дадзены момант павышана попыту на нейкія пазіцыі не назіраецца, бо ў Мінску толькі нядаўна скончыліся сельскагаспадарчыя кірмашы і рэалізацыя пладова-агароднінай прадукцыі фермерамі, якую яны арганізоўвалі ў дварах. У прыватнасці, каля «Чыжоўка-Арэны» дзейнічаў самы вялікі сталічны кірмаш, які працаваў на працягу некалькіх тыдняў. З гэтага вынікае, што попыт пакупнікоў быў задаволены цалкам.

Вольга АНУФРЫЕВА.

НА ПАРАДКУ ДНЯ

Наталля КАЧАНАВА:

«Самае галоўнае — работа з людзьмі, выслухаць іх, данесці ім праўду»

У Гродне прайшло выязное пашыранае пасяджэнне прэзідыума Савета Рэспублікі, дзе абмеркавалі вынікі работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Гродзенскай вобласці за 11 месяцаў гэтага года. Напярэдадні члены прэзідыума правялі прыёмы грамадзян у 10 раёнах вобласці. Некаторыя звароты датычыліся прапаноў па ўдасканаленні работы са зваротамі грамадзян.

Сенатары невыпадкова здзейснілі свой «дэсант» на Гродзеншчыну. Зараз у парламенце вядзецца работа над законапраектам аб звароце грамадзян. Праект прайшоў першае чытанне ў Палаце прадстаўнікоў, хутка будзе разглядацца ў другім чытанні. Затым паступіць у Савет Рэспублікі.

Па словах Наталлі Качанавай, сенатары актыўна ўдзельнічаюць у распрацоўцы змяненняў і дапаўненняў у закон на самай пачатковай стадыі. У сувязі з гэтым важна ўбачыць, як канкрэтна складваецца сітуацыя ў розных рэгіёнах краіны.

— Наша краіна можа стаць прыкладам у падыходах і рабоце са зваротамі грамадзян, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Галоўны прынцып — працаваць на папярэджанне праблемы. Для гэтага трэба ведаць, чым жывуць рэгіёны. Чым больш мы сустракаемся з людзьмі, тым больш шанцаў, што ў людзей будзе менш пытанняў.

Было адзначана, што за 11 месяцаў у Савет Рэспублікі паступіла каля 7 тысяч зваротаў, што на 25 % больш аналагічнага перыяду мінулага года. Між тым з Гродзенскай вобласці такіх зваротаў усяго 7 % ад агульнай колькасці, самы нізкі паказчык у краіне. Гэта сведчыць аб тым, што многія праблемы грамадзян вырашаюцца на месцах і ў жыхароў рэгіёна няма асаблівых патрэб звяртацца ў вышэйшыя органы ўлады. Дарэчы, гродзенцы звяртаюцца да сенатараў не толькі па бытавых праблемах, але і з просьбамі патлумачыць нейкія заканадаўчыя аспекты, а таксама прапанаваць свае ідэі і ініцыятывы. У гэтым сэнсе важна, каб кожны заяўнік меў упэўненасць, што на яго просьбу адгукнуцца і адрэагуюць належным чынам.

— Кіраўнікам на месцах іншы раз не хапае цярпення, каб спакойна выслухаць людзей. Там іншы раз і вырашаць нічога не трэба, проста ўважліва паслухаць чалавека, а не пускаць яго далей па інстанцыях, каб ён у выніку прыносіў нам тоўстыя папкі з перапіскай. Так адбываецца, калі чалавека адпраўляюць з аднаго месца ў іншае. Гэтага нельга рабіць, — звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі падчас работы пасяджэння. — Заўважу, што 18 % заяўнікаў просяць проста тлумачэння нейкіх нарматыўных актаў. Калі іх адпраўляць, гэта выклікае незадаволенасць. Жыццё паказвае, што, калі мы не будзем працаваць з людзьмі, з імі будуць працаваць іншыя і навязваць зусім іншыя для нас каштоўнасці, таму нельга ставіцца фармальна. Гэта наша работа, наш святы абавязак. Калі мы будзем рабіць на сваіх месцах тое, што мы павінны, будзе зусім іншая карціна.

Што датычыцца Гродзенскага рэгіёна, колькасць зваротаў да мясцовых органаў улады зменшылася на 5 %. Па словах **намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктара ПРАНЮКА,** адзін з фактараў, што паўплываў на змяншэнне колькасці зваротаў, — прамыя тэлефонныя лініі. У вобласці іх праведзена каля адной тысячы, звярнулася больш за чатыры тысячы чалавек. Таксама шырока практыкуюцца прыёмы грамадзян як на месцы, так і на выездзе. Пры неабходнасці прадстаўнікі заканадаўчай і выканаўчай улад праводзяць прыёмы на прадпрыемствах вобласці, каб вырашыць тыя ці іншыя набалелыя праблемы як сацыяльныя, так і вытворчыя. стар. 17

Анатоль ІСАЧАНКА:

«Комплексны падыход дазваляе прымаць своечасовыя заканадаўчыя рашэнні, накіраваныя на развіццё рэгіёнаў»

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі правёў асабісты прыём грамадзян у Скідзелі

Такой магчымасцю скарысталіся пяцёра жыхароў горада-спадарожніка абласнога цэнтра. Спектр пытанняў, якія агучылі заяўнікі, традыцыйны: добраўпарадкаванне вуліц, дарог, пенсійныя налічэнні, праблемы з электразабеспячэннем.

Аб неабходнасці абнаўляць дарожнае пакрыццё ў раёне аўтавакзала віцэ-спікеру Савета Рэспублікі расказала мясцовая жыхарка. Яна звярнула ўвагу на тое, што горад паціху прыводзяць да ладу, а тут нічога не мяняецца гадамі. Аналагічную праблему агучылі і суседзі з вёскі Гліняны, маўляў, дарожнае палатно размывае так, што дабрацца на работу жонцы ў бальніцу немагчыма нават на «ВАЗе», які мужчына спецыяльна для яе купіў. Трэба сказаць, што дарожнікі не адмаўляюць у бягучым абслугоўванні пад'язных шляхоў, але патрэбных капітальных укладанняў нават на невялікі кавалак з кіламетр (аб якім ішла гаворка) пакуль няма.

Анатоль Ісачанка паабяцаў разабрацца ў дадзеным пытанні і накіраваць профільных спецыялістаў, якія змогуць даць рэальную ацэнку ўзнятай дарожнай праблеме.

Калектыўную просьбу данеслі жыхары вуліцы Меліяратараў у Скідзелі, якія ўвесь час сутыкаюцца з праблемамі электразабеспячэння: то вулічнае асвятленне знікне, то ў дамах перабоі са святлом, то электрыкі не прыязджаюць на выклік. Яны распавялі, што такая сітуацыя ўзнікла пасля расфармавання прадпрыемства меліяратыўных сістэм два гады таму і непрыняцця на баланс электрасетак ніводнай з арганізацый горада. Атрымліваецца, што сеткі да гэтага часу нічыйныя. Людзі спраўна плацяць грошы за выкарыстаную электраэнергію, але вымушаныя мірыцца з такой нязручнасцю да гэтага часу.

Анатоль Ісачанка перакананы: людзі маюць рацыю.

— За два гады гэтую праблему маглі вырашыць, — падкрэслівае парламентарый. — Таму да канца студзеня людзі павінны плаціць каму трэба, і іх павінны абслугоўваць так, як трэба. Калі патрабуецца падключыць Міністэрства энергетыкі — гэта будзе зроблена, аднак перакананы, што пытанне можа быць вырашана на мясцовым узроўні без якіх-небудзь затрымак.

Вырашэнне згаданага пытання сенатар узяў на ўласны кантроль.

Яшчэ адна заяўніца прыйшла да віцэ-спікера Савета Рэспублікі з праблемай няўлічвання стажу, калі яна працавала на Украіне, пры разліку яе пенсіі. Як удакладнілі спецыялісты ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароны Гродзенскага райвыканкама, калісьці жанчына працавала ў сакрэтным абаронным НДІ, яны адпраўлялі тры запыты ў Львоў і Кіеў, але станоўчага адказу не атрымалі. Паколькі для разліку патрабуюцца дакументы (аднаго толькі запыту ў працоўнай кніжцы недастаткова), пацвердзіць суму заробку ў арганізацыі пакуль немагчыма.

Анатоль Ісачанка даручыў профільным прафсаюзам узяць пытанне пад кантроль, бо падобныя звароты — не рэдкасць.

Каментуючы журналістам вынікі прыёму, намеснік старшыні Савета Рэспублікі адзначыў, што такія стасункі даюць магчымасць атрымаць яшчэ адзін канал камунікацыі з прадстаўнікамі розных узроўняў улады, а таксама пачуць адказы на многія пытанні.

На яго думку, практыка асабістых прыёмаў грамадзян рознымі службовымі асобамі ўжо не адзін год даказвае сваю эфектыўнасць.

— Дзякуючы прыёмам грамадзян, вызначаем, куды накіраваць рэсурсы, каб максімальна задаволіць патрэбы людзей. Мясцовая ўлада вырашыць, на што ў першую чаргу іх накіраваць. Пры гэтым трэба вызначыць найбольш балючыя пытанні. Як правіла, людзей хвалююць праблемы асабістага характару, а таксама грамадскія, звязаныя з добраўпарадкаваннем таго населенага пункта, дзе яны пражываюць, — звяртае ўвагу Анатоль Ісачанка.

Ён перакананы, што шэраг прыватных праблем, з якімі звяртаюцца людзі, не патрабуе выдзялення дадатковага фінансавання і можа быць вырашаны на месцы.

— Аднак у цэлым падобны комплексны падыход да работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб дазваляе прымаць своечасовыя заканадаўчыя рашэнні, накіраваныя на развіццё рэгіёнаў Беларусі, — падсумаваў парламентарый.

Вольга АНУФРЫЕВА.

АКЦЭНТЫ

У рабоце са зваротамі важнае добрае стаўленне да людзей

Такую думку выказала ў гутарцы з журналістамі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падчас правядзення адзінага дня прыёму грамадзян сенатарскім корпусам, які прайшоў у сераду, 8 снежня, на Гродзеншчыне.

На асабісты прыём прыехалі з усёй краіны

Трэба сказаць, што ў Панямонні высадзіўся сапраўдны сенатарскі «дэсант»: у рэгіёне працуюць члены Прэзідыума Савета Рэспублікі і сенатары, абраныя ад Гродзеншчыны ў верхнюю палату парламента.

У прыватнасці, спікер Савета Рэспублікі прымае людзей у Лідзе. Звычайна колькасць жадаючых трапіць на асабісты прыём да яе вялікая. Вось і гэтым разам на прыём запісалася некалькі дзясяткаў чалавек — яны адмыслова прыехалі на прыём да Наталлі Качанавай з розных рэгіёнаў краіны.

Фота БелТА.

Традыцыйна спікер верхняй палаты парламента прымае людзей да апошняга пытання, без увагі не застанецца ніводная з агучаных праблем. Спектр агучаных тэм, як заўсёды, разнастайны: тут і ўладкаванне дарог, і паляпшэнне жыллёвых умоў, і дзейнасць жыллёва-камунальнай гаспадаркі, і карыстанне зямлёй, будаўніцтва, пенсійнае забеспячэнне, працаўладкаванне.

Уладзіслаў Часлававіч і Валянціна Вацлаваўна з вёскі Яськаўцы Дубровенскага сельсавета, што на Лідчыне, прыйшлі з калектыўнай просьбай ад аднавяскоўцаў: людзі просяць абазначыць іх населены пункт. Справа ў тым, што вёска хутарнага тыпу, дамы размешчаны адзін ад аднаго на вялікай адлегласці, паміж імі — дачныя кааператывы. Адсюль — адсутнасць дарожнага абслугоўвання, з-за чаго нават «хуткая» не можа даехаць. Людзі кажуць: не працуе навігатар, відавочна, з-за адсутнасці населенага пункта ў рэестры. Што цікава: вёска размешчана за палову кіламетра ад мяжы горада. Акрамя таго, кажуць заяўнікі, няма вулічнага асвятлення. Да аўтобуснага прыпынку трэба ісці праз лес у абсалютнай цемры, бо дарога зарасла. З 2019-га жыхары самі расчышчалі ад расліннасці «нічыйную» дарогу, правялі не адзін суботнік уласнымі сіламі, каб не хадзіць да прыпынку праз лес, бо гэта небяспечна. Цяпер просяць мясцовыя ўлады далучыцца, каб усё ж вызначыць статус дарогі.

Вырашэнне пытання вышэй возьме на асабісты кантроль **старшыня Лідскага райвыканкама Сяргей ЛОЖЭЧНІК,** які таксама прысутнічаў на прыёме.

Дарожную тэматыку працягнула Ірына Аляксееўна са Шчучыншчыны. Жыхарка аграгарадка Тапілішкі расказала спікеру Савета Рэспублікі, што дарога па вуліцы Заводскай патрабуе асфальтавага пакрыцця, бо ў міжсезонне дажджы размываюць яе так, што немагчыма праехаць. А дабіцца грэйдара нерэальна. Жанчына ўжо звярталася з такім пытаннем у райвыканкам летась, але грошай на ўкладку новага палатна няма.

З аналагічнай праблемай прыйшла на прыём і Вольга Аляксееўна з Оршы. Яна звярнула ўвагу на стан дарогі па вуліцы 5-ы завулак Грачыхі. Вырашэнне згаданых праблем даручана мясцовым уладам.

П'янаму не месца за рулём, але што рабіць каршэрынгавай фірме?

Яшчэ адна аршанка — Паліна Цімафееўна — прыехала ў Ліду са сваёй бядой: ужо пенсіянеркай яна паехала даглядаць хворую сястру ў ЗША, прабыла там сем гадоў, а калі вярнулася дадому, то атрымала пенсію толькі за тры гады. Жанчына не разумее — чаму? Палічыўшы гэта несправядлівым, пенсіянерка пачала шукаць праўды.

Наталля Качанава запэўніла жанчыну, што з усімі нарматыўнымі нюансамі разбяруцца спецыялісты і растлумачаць ёй механізм налічэння і выплаты пенсіі.

Трэба сказаць, што пытанні пенсіённага забеспячэння агучвалі і іншыя заяўнікі. Напрыклад, жыхарку Бярозаўкі Тамару Канстанцінаўну таксама хвалюе пытанне налічэння пенсіі. Яна сцвярджае, што ў 2014-м атрымала грамадзянства Рэспублікі Беларусь і далей пачаліся праблемы з налічэннем стажу і памерам пенсіі. Аб неабходнасці пераразліку казала і Ганна Мікалаеўна з Беліцкага сельсавета. Жанчына расказала, што ў 1990-х гадах працавала ў кааператыве пры заводзе «Лідсельмаш», але дакументы былі страчаны.

Старшыня Савета Рэспублікі запэўніла кожную з заяўніц, што іх пытанні будуць разгледжаны з прыцягненнем спецыялістаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Не засталіся па-за ўвагай і пытанні духоўныя: жыхарка Жыровіч Людміла Пятроўна ўзняла пытанне развіцця Жыровіцкага манастыра. Яна расказала Наталлі Качанавай аб ходзе рэалізацыі запланаваных рамонтных работ, а таксама выказала занепакоенасць работай кафэ, якое знаходзіцца побач са святыняй. Спікер Савета Рэспублікі перакананала нераўнадушную заяўніцу, што ўсе прыведзеныя факты будуць агучаны кіраўніцтву Гродзенскага аблвыканкама для праверкі і прыняцця мер.

Між іншым, гучалі не толькі скаргі на недапрацоўкі мясцовых улад, але і прапановы па паляпшэнні існуючага заканадаўства. Так, мінчанін Максім Ігаравіч, кіраўнік аднаго з каршэрынгавых клубаў, растлумачыў, што за паўторнае знаходжанне кіроўцы ў нецвярозым стане за рулём цяпер, згодна з заканадаўствам, адбываецца канфіскацыя машыны. Парк каршэрынгавых аўтамабіляў сталічнай фірмы сёння налічвае 605 адзінак. Фірма ўжо сутыкнулася з канфіскацыяй па рашэнні суда машыны ў такім выпадку, пад арыштам знаходзяцца яшчэ чатыры. Ці ж гэта справядліва ў дачыненні да добрасумленнага суб'екта гаспадарання, які аказвае транспартныя паслугі? Магчыма, варта прадугледзець папраўкі ў нарматыўныя акты з улікам даведзенага факта?

Уважлівыя адносіны — перш за ўсё

Як растлумачыла журналістам спікер верхняй палаты парламента, работа са зваротамі грамадзян у нашай краіне мае сістэмны характар. У Савеце Рэспублікі аналізуюць звароты, якія прыходзяць з таго ці іншага рэгіёна Беларусі, усе яны маюць як агульныя рысы, так і свае асаблівасці. Брастаўчане, напрыклад, больш далучаныя да зямлі і імкнуцца атрымаць яе ў карыстанне ў большых аб'ёмах, каб мець магчымасць зарабіць. А сёння ў Лідзе Наталля Качанава звярнула ўвагу на сацыяльны ракурс агучаных тэм.

— Кожны раз мы бачым, якія ёсць пытанні ў адпаведнасці са спецыфікай развіцця рэгіёна, — кажа яна. — Але, разам з тым, у сваёй рабоце мы бачым добрае стаўленне да людзей.

Інакш кажучы, чалавека часам трэба проста паслухаць, каб ён разумеў, наколькі тое ці іншае пытанне вырашаецца ў краіне.

— Бывае, людзі жывуць са сваёй праблемай, нікуды не звяртаюцца і лічаць, што, напэўна, гэта безвынікова і немагчыма, — акцэнтуе ўвагу Наталля Качанава. — На самай справе, проста дзяржслужачыя, чыноўнікі, кіраўнікі арганізацый, прадпрыемстваў, якія праводзяць прыёмы па асабістых пытаннях, павінны ўважліва адносіцца да тых, хто да іх звяртаецца. Тады будзе поўнае ўзаемадзеянне.

Яна перакананая ў важнасці пасядоўнасці: калі чалавек звярнуўся — неабходна давесці яго даручэнне да лагічнага завяршэння.

— Каб не атрымалася так: у адну інстанцыю звярнуліся, у другую — а справа стаіць, — кажа яна і звяртае ўвагу на выпадкі, калі дапамагчы чалавеку з пункту гледжання заканадаўства немагчыма. — Тады хтосьці ў інстанцыі павінен давесці, што ў адпаведнасці з законам вырашыць гэтае пытанне немагчыма. Трэба набрацца цярпення, доўгага стаўлення да чалавека, каб проста яму растлумачыць.

Яна нацэльвае на такі прынцып работы ўвесь дзяржаўны апарат і дэпутацкі корпус краіны.

— У нашай рабоце мы глядзім, каб да людзей найперш было добрае стаўленне, — звяртае ўвагу Наталля Качанава і нагадвае аб той ролі, якую адводзіць рабоце са зваротамі грамадзян кіраўнік краіны.

Даючы ацэнку такой форме работы як адзіны дзень прыёму грамадзян у рэгіёне, спікер верхняй палаты парламента сцвярджае, што яна добра сябе зарэкамендавала.

— Яна дае магчымасць нам і нашым калегам убачыць, на якім узроўні павінны разглядацца звароты і як вырашаюцца гэтыя пытанні на рэспубліканскім узроўні ў адпаведнасці з заканадаўствам, прынятым у нашай краіне, — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Сядзі і глядзі

Тыдзень беларускага кіно на «Беларусь 3»

ШТОГОД 17 снежня адзначаецца Дзень беларускага кіно. Менавіта ў гэты дзень у 1924 годзе, калі была створана першая афіцыйная кінастудыя «Белдзяржкіно», пачалася гісторыя кінамастацтва Беларусі. З нагоды прафесійнага свята кінематаграфістаў тэматычны эфірны тыдзень прапануе гледачам сацыякультурны тэлеканал. Зможам убачыць фільмы розных перыядаў і жанраў, а таксама дакументальныя праекты пра жыццё і творчасць рэжысёраў, сцэнарыстаў і кінааператараў, акцёраў вялікага экрана.

З 13 да 19 снежня ў сетцы перадач «Беларусь 3» — шаснаццаць ігравых фільмаў беларускай вытворчасці: ваенныя, драматычныя і прыгодніцкія стужкі, экранізацыі класікаў літаратуры прадставяць культурна-гістарычны зрэз айчыннага кінематографа з канца 50-х гадоў мінулага стагоддзя і да нашых дзён. Упершыню на тэлебачанні пакажуць новы дакументальны фільм «Максім Танк. Натуральны, як лінія небасхілу» рэжысёра Яўгена Сяцько, прысвечаны народнаму паэту Беларусі, які ў сярэдзіне 30-х гадоў мінулага стагоддзя змагаўся за вызваленне беларускага народа ад польскага прыгнёту.

Спецыяльны паказ чакае і малодшую аўдыторыю тэлеканала. Для яе запланавана дэманстрацыя такіх анімацыйных работ мастакоў студыі «Беларусьфільм» як «Вясна ўвосень», «Магістр вольных мастацтваў», «Прыгоды Несуркі», а таксама прэм'ера гэтай восені — навучальны мультфільм «Дзядзі». Любімыя праграмы «Калыханка» і «Дабраранак» таксама падрыхтавалі цікавыя кароткаметражныя мультфільмы беларускай вытворчасці.

У фільме «Час надзей» з цыкла «Кіно маёй краіны» з Уладзімірам Арловым успомнім беларускае кіно 1960-х. Пра галоўнае — тых, без каго амаль векавая гісторыя айчыннага кінамастацтва была б немагчымая, раскажуць партрэтныя праекты «Камертон», «Кадры жыцця», «Люблю і памятаю». Герояміперадач стануць вядомыя дзеячы кіно мінулага і сучаснасці: Уладзімір Корш-Саблін, Валерый Рубінчык, Аляксандр Яфрэмаў, Галіна Адамовіч, Уладзімір Бокун, Ігар Волчак, Таццяна Кубліцкая, а таксама беларускія артысты Генадзь Гарбук, Віктар Тарасаў, Валерыя Арланава і іншыя.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 154

У мінулым выпуску мы паведамлялі, што ў Картрэйку (Бельгія) праходзіў чэмпіянат Еўропы па шашках-100 сярод моладзі да 27 гадоў, дзе Яна Якубовіч і Дзмітрый Немец выйгралі званне чэмпіёнаў Еўропы ў класічнай праграме. Яна выйграла яшчэ два залатыя медалі ў бліцы і па хуткай гульні, такім чынам стаўшы абсалютнай чэмпіёнкай Еўропы.

№ 139



№ 139 vitalavvs — samandar

Белыя простыя шашкі: c1, e1, d2, f2, h2, a3, c3, g3, h4, a5 (10)

Чорныя простыя шашкі: e5, g5, d6, f6, h6, a7, c7, d8, f8, h8 (10) Гэтая пазіцыя адбылася ў бліц-партыі ў інтэрнэце на гульнявым сайце playok.com.

Белыя згулялі 1.f2-e3! і паганяюць звязкай. Як абараняцца чорным? У іх ёсць удар, знайдзіце яго і ацаніце наступствы.

Наш чытач з Глыбокага Віцебскай вобласці Васіль Марцінкевіч даслаў сваю партыю, згуляную таксама ў інтэрнэце, з вельмі прыгожай камбінацыяй.

№ 140 Мядзведзь — Марцінкевіч

1. c3-d4 f6-g5 2. g3-f4 g7-f6 3. b2-c3 h8-g7 4. h2-g3 g5-h4 5. c1-b2 d6-c5 6. c3-b4 f6-g5 7. b4:d6 e7:c5 8. d2-c3 c7-d6 9. c3-b4 g7-f6 10. b4-a5 d8-c7 11. b2-c3 f6-e5 12. d4:f6 g5:e7 13. c3-d4 e7-f6 14. a1-b2, а цяпер камбінацыя, знайдзіце яе. Застаецца дадаць, што такая ж самая камбінацыя з пераменай колеру з'явілася значна раней, яшчэ ў мінулым стагоддзі.

№ 141 Кукуеў Н. — Чорны С.

Белыя простыя шашкі: c1, g1, f2, h2, a3, c3, e3, g3, f4, a5 (10)

Чорныя простыя шашкі: h4, c5, e5, b6, d6, h6, c7, g7, b8, d8 (10)

№ 142 vitalavvs — kostyan2

Белыя простыя шашкі: c1, e1, g1, e3, d4, c5 (6)

Чорныя простыя шашкі: h2, f6, c7, b8, d8, f8 (6)

Дадзеная пазіцыя таксама назіралася ў бліц-партыі ў інтэрнэце. Белыя маюць цэнтр і вырашылі захапіць важны пункт f4. 1.e3-f4?, што стала ключавой памылкай. Чорныя адказалі 1... d8-e7! і высвятляецца, што няма добрых ходаў, далей было 2.e1-d2 f6-g5 3.f4:h6 f8-g7 4.h6:d6 c7:e1+

Літоўскі гросмайстар па шашачнай кампазіцыі Валдас Беляўскас прапануе ў шашкі-100 дзве пазіцыі — «двайняты» (расстаноўка шашак амаль аднолькавая, а рашэнне рознае).

№ 143

Белыя простыя шашкі: 38, 30, 18, 19, 11, 12, 13 (7)

Чорныя простыя шашкі: 44, 39, 35, 27, 21, 24, 6 (7)

№ 144

Белыя простыя шашкі: 38, 30, 18, 19, 11, 12, 13 (7)

Чорныя простыя шашкі: 44, 37, 35, 27, 21, 24, 6 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Выпуск № 153 ад 26.11.2021.

№ 134 1.c3-b4 a3:c5 2.d4:g5 a7-b6 3.a5:c7 b8:h6 4.e3-f4 g7-f6 5.g1-f2 f6-g5 6.f4-e5 g5-h4 7.e5-d6 h6-g5 8.d6-c7 g5-f4 9.c7-b8 h4-g3 10.f2:h4 f4-e3 11.b8-f4 e3:g5 12.h4:f6+

№ 135 1.g5-f6 e7:g5 2.c7-d8 h8:f6 3.f2-g3 h4:d4 4.d2-e3 d4:f2 5.e1:g3 g5:e3 6.d8:d6 h2:f4 7.d6:h2+

№ 136 1.39-33 28:48 2.37:06 36:47 3.06-01 47:20 4.01:34 48:30 5.15:35+

№ 137 1.39-34 40:20 2.25:03 36:47 3.03-08 47:35 4.08:40 35:44 5.49:40+

№ 138 1.49-44 39:50 2.31-27 50:06 3.27-22 06:20 4.25:01 35:24 5.01:20 15:24 6.48-43 24-30 7.43-39 30-35 8.39-34 35-40 9.34:45+

Першыя дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г . Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013,

e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Духоўныя арыенціры — у эфіры

Вера, слова Божае і адчуванне еднасці — менавіта гэта дае надзею, супакаенне ў наш няпросты час хвароб і ўзрушэнняў. Магчымасць далучыцца да агульнай малітвы для кожнага верніка вельмі важная, якія б акалічнасці не былі таму перашкодай. І ў першую нядзелю Адвэнту, калі каталікі ўсяго свету пачалі падрыхтоўку да вялікага свята Раства, у эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё правялі прамую трансляцыю набажэнства аб міры, адзінстве і згодзе. Аднаўленне нядзельнай малітвы ў эфіры рэалізавалася пры садзейнічанні Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь сумесна з Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіяй Рымска-каталіцкага касцёла ў Рэспубліцы Беларусь.

— Мы пачалі рэгулярныя трансляцыі нядзельных мес напрыканцы лістапада ў першы дзень каталіцкага Адвэнту. А яшчэ сёлета ў нас была трансляцыя ў красавіку, якую мы прымяркоўвалі да Вялікадня. Праводзілася акцыя «Малітва за мір і адзінства», дзе трансляваліся малітвы розных канфесій: каталіцкай, праваслаўнай, мусульманскай, іўдзейскай, — расказвае **генеральны прадзюсар Беларускага радыё Антон ВАСЮКЕВІЧ.** — Напярэдадні посту перад Нараджэннем Хрыстовым у нас адбылася сустрэча з новым мітрапалітам каталіцкай царквы ў Беларусі Ёзафам Станеўскім. Мы дамовіліся, што вось гэтыя дні Адвэнту ў нас будуць магчымасцю для ўсіх вернікаў маліцца дыстанцыйна. Таму і зараз, і на Раство ў нас адбудуцца трансляцыі святочных набажэнстваў. Калі ў тым будзе запатрабаванасць сярод вернікаў, то чаму б не рабіць гэта і далей? Мы заўсёды адкрытыя для абмеркавання розных ідэй і супрацоўніцтва. І гэта была менавіта ініцыятыва Беларускага радыё прадэманстраваць у нашым эфіры ўсю рознабаковасць і шматканфесійнасць і тую згоду, якая ў нас існуе. Тым больш што сёлета ў Беларусі Год народнага адзінства. Такая добрая справа адлюстроўвае шмат і пачуццяў, і памкненняў, і таму ініцыятыва была ўспрынята станоўча кіраўніцтвам канфесій, яны адгукнуліся і прынялі ўдзел у агульнай малітве.

...Адзінства і мір — вялікая каштоўнасць як для асобнага чалавека, так і для ўсяго грамадства. Беларусь заўсёды была прыкладам таго, як павінны ставіцца адно да аднаго людзі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў. Этнаканфесіянальны свет можа быць моцным і даўгавечным толькі на аснове агульных каштоўнасцяў. У нашай краіне вернікі разам стаяць на абароне Айчыны, паважаюць нацыянальныя традыцыі і дзяржаўныя сімвалы. Усё гэта надзвычай важна сёння, калі па ўсім свеце адбываецца раздзяленне і канфлікты. Людзі з трывогай выказваюцца супраць расколу нашага грамадства, асабліва калі для гэтага выкарыстоўваюцца пачуцці вернікаў. У адрас Белтэлерадыёкампаніі рэгулярна паступаюць звароты ад прадстаўнікоў розных канфесій, у якіх адзначаецца, як важна захаваць мір і згоду на беларускай зямлі. Просьбы аб гэтым гучаць і ў малітвах, аднак з-за пандэміі многія вернікі не могуць наведваць храмы. Адзінай магчымасцю далучыцца да духоўнага слова застаецца трансляцыя ў радыёэфіры богаслужэнняў, зваротаў кіраўнікоў рэлігійных канфесій, духоўна-асветніцкіх праектаў.

Напрыклад, па выхадных у эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё можна пачуць перадачы «Духоўнае слова» і «Святло душы», дзе знаходзяць адлюстраванне падзеі з жыцця праваслаўнай канфесіі. На Міжнародным радыё «Беларусь» транслююцца ў тым ліку і каталіцкія праграмы. Не абмінаюць у эфірнай прасторы значныя падзеі і важныя святы розных канфесій. Яшчэ варта адзначыць, што ў хуткім часе на радыё «Культура» мы зможам пачуць сумесны праект з расійскім праваслаўным «Радыё «Вера». Пакуль рана казаць адназначна, у якім фармаце будзе ўсё адбывацца, але тут маюць планы на шчыльнае і плённае супрацоўніцтва. Духоўнасць актуальная ва ўсе часы.

Алена ДРАПКО.

«Са "Звяздой" цяплей»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 студзеня 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны 7 тэрмасаў універсальных для ежы і напояў ARIZONE і суперпрыз — электрасамавар Kelli. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 29 студзеня 2022 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2022 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Звязда» чытайце ў нумары 235 газеты «Звязда» ад 4 снежня 2021 года.

Тэлефоны для даведак: (017) 271 81 53, 311 17 40.
Тэрмін правядзення гульні — 7—31 снежня 2021 года.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4117 ад 30.11.2020 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)
на I квартал або I паўгоддзе 2022 года

Хатні адрас і тэлефон _____
(абавязкова)
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 1.05 Зона Х (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Драма «Іншыя» (16+).
13.05, 15.25 Драма «Гарадская рапсодыя» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Драма «Халодныя берагі». 1-я серыя (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
22.00 Серыял «След» (16+).
0.50 Арэна.
1.25 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 11.10, 21.05 Тэлебарометр.
9.05, 19.50 «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.15 «На тыдзень» (16+).
11.40 Серыял «Стыч!» (6+)
12.40 «Неверагодная гісторыя аб гіганцкай грушы» (6+).
14.05 «Усёй сям'ёй» (6+).
15.00 Драма «Памятаеш мяне?» (12+)
16.45 «Тры першыя спатканні» (16+).
17.40 «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
18.40 «На кручку» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
7.05 «Правілы жыцця».
7.35 «Найвялікшыя вынаходкі чалавецтва». Серыял [СЦ].
8.35 Колер часу.
8.45 Легенды сусветнага кіно.
9.10, 16.15 «Народжаная зоркай». Тэлесерыял.
10.20 «Мы — цыганы». Пастаноўка Мікалая Слічэнкі.
11.45 «Забытае рамяство».
12.00 «Вадзім Знаменаў і яго «Пецергоф». Дак. фільм.
12.30 Улада факта.
13.15 «Вялікія міфы. Ілія-да». Серыял.
13.45 «Д'яблы». Маст. фільм [СЦ].
15.05 Лісты з правінцыі [СЦ].
15.35 «Энігма. Юджа Ванг».
17.00 «Дажывём да панядзелка». Шчасце — гэта калі цябе разумеюць». Дак. фільм. [СЦ].
17.45 Легендарныя канцэрты. Уладзімір Васільеў, Кацярына Максімава, Ніна Цімафеева, Ніна Семізорава, Ала Міхальчанка, Андрыс Ліепа.
18.45 «Білет у Вялікі».
19.45 Усерасійскі адкрыты тэлевізійны конкурс юных талентаў «Сіняя птушка».
21.00 Лінія жыцця [СЦ].
21.55, 1.35 Шукальнікі [СЦ].
22.40 «2 Вернік 2».
23.50 «Анімацыя». Маст. фільм.
2.20 «Арганаўты», «Дагані-вецер». М/ф для дарослых.

Настальгія

6.00 Фільм-канцэрт «З дазволу праграмы «Бенефіс» (12+).
6.55, 1.10 Мастацкі фільм «Мой лёс» (16+).
8.15 «І жартам, і сур'ёзна» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
9.40, 15.40, 17.00, 18.00, 18.50, 21.40, 23.40, 0.50, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
10.00, 16.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00 «Навагодняе прадстаўленне» (12+).
12.00 Фільм-спектакль «Вялікая магія» (12+).
14.25 Фільм-канцэрт «Сумаваць не трэба» (12+).
17.20, 23.00 «Блеф-клуб» (16+).
18.05 «Да і пасля...» (16+).
19.00 Мастацкі фільм «Небяспечны ўзрост» (16+).
20.30 Рытмічная гімнастыка (12+).
22.00 «Колба часу» (16+).
0.00 «Эліта Краіны Саветаў» (16+).
2.30 Фільм-канцэрт «Ленінградскія акварэлі» (12+).

EuroSport 1

1.00, 7.30 Біятлон. КМ. Жанчыны (6+).
2.00, 2.45 Снаўборд. КМ (16+).
3.30 Лыжныя гонкі. КМ. Мужчыны (6+).
4.15 Лыжныя гонкі. КМ. Жанчыны (6+).
5.00, 8.30, 21.00, 21.55 Снукер. Сусветны Гран-пры (6+).
7.00 Тэлечасопіс Eurosport Winter Pass #4 (16+).
10.30 Конны спорт. Турнір Вялікага шлема (6+).
11.30, 12.00, 12.20, 15.15, 17.30 Лыжнае дваябор'е. КМ. Жанчыны (6+).
13.00, 13.30, 20.00. Горныя лыжы. КМ. Мужчыны (16+).
15.50 Біятлон. КМ. Ансі. Мужчыны.
19.00 Скачкі на лыжах з трамплiна. КМ. Кваліфікацыя (16+).
21.50 Навіны (16+).

Кінакамедыя

1.05 Прышэльцы-2: каліморы часу (12+).
4.00 Браты з Грымсбі (18+).
5.25 Касталом (16+).
7.20 Паляўнічыя на прывідаў (6+).
9.15 Шэрлак Холмс: гульня ценяў (12+).
11.35 Кракадзіл Дандзі-2 (6+).
13.40 Хлопец з нашых могілак (12+).
15.20 Куленепрабівальны (12+).
17.15 Правілы здыму: метад Хітча (12+).
19.30 Голая праўда (16+).
21.15 З вачэй — далоў, з чарта — прэч! (16+)
23.15 Ілюзія падману-2 (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.35 «Тры ў адным» (12+).
9.40 «Пачаснаку» (12+).
10.20 «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
11.50 «Знакі лёсу» (16+).
12.30, 18.00, 1.40 «Сляпая» (16+).
13.35, 19.10, 2.40 «Варажбітка» (16+).
14.45, 3.35 «Апакаліпсіс» (16+).
15.50 «Містычныя гісторыі» (16+).
16.55, 22.00 «Якія вярнуліся» (16+).
20.20 «Любоўная магія».
23.05 «Пяты элемент» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.00, 5.40, 17.20, 18.05 Элементарна (16+).
6.20 Буслы (6+).
7.45 Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана (16+).
10.45 Адзінаццаць сяброў Оўшэна (16+).
12.55 Дванаццаць сяброў Оўшэна (16+).
15.05 Трынаццаць сяброў Оўшэна (16+).
19.00 Місія: невыканальная (12+).
21.00 Місія: невыканальная-2 (12+).
23.15 Місія: невыканальная-3 (16+).
1.25 Авіятар (16+).
4.10 Маленькі Манхэтэн (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Напарнік (12+).
7.55 Стэндап пад прыкрыццём (16+).
10.00 Здань (6+).
12.00 Тэрмінова выйду замуж (16+).
14.00 Нявеста любой цаной (16+).
15.55, 16.50, 18.00, 18.55 Шэрлак у Расіі (16+).
20.00 Змешаныя пачуцці (16+).
21.35 Жыццё наперадзе (16+).
23.05 Вайна полаў (16+).
0.45 Пятніца (16+).
2.10 Цёмны свет (16+).
3.45 Цёмны свет: раўнавага (12+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.30, 6.50, 5.10, 5.35 Гульні розуму (16+).
7.20 Панарама 360°: разбурэнне аб'ектаў сусветнай спадчыны (16+).
8.10 Панарама 360°. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
9.05 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала (16+).
9.50 Ледзяная дарога (16+).
10.45, 11.35 Дзікі тунец (16+).
12.20, 16.40 Нязведаныя воды з Джэрэмі Уэйдам (16+).
13.15, 14.05 Аўта-SOS (16+).
14.55, 19.15, 20.05, 2.45 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.50 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
17.30 Падарожжы з Гордданам Рамзі (16+).
18.25, 18.50 Фабрыка ежы (16+).
21.00, 3.30 Найбуйнейшыя тэхнагенныя катастрофы (16+).
21.50 Узнімаецца бура (16+).
22.40 Закінутыя гарады з Альбертам Лінам (16+).
23.35 Рэальнасць ці фантастыка? (16+)
0.30, 0.50 Гісторыя дзесяцігоддзяў (16+).
1.15, 2.00 Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
4.20, 4.45 Зона будаўніцтва (16+).

Discovery

8.00, 7.35 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Паляўнічыя на склады (16+).
10.15, 10.40, 21.15, 21.40, 1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04 Як гэта ўстроена? (12+)
12.05, 13.00 Залатая ліханка (16+).
13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10 Багажныя войны (12+).
17.35 Выжыванне без купюр (16+).
18.30, 18.55 Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
19.25, 4.27 Хуткія і гучныя (12+).
23.05, 5.14 Аляска: сям'я з лесу (16+).
0.00, 6.01 Аперацыя «Выратаванне дома» (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25, 18.15 Зона Х (16+).
9.10 Серыял «След» (16+).
10.50 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Драма «А ў нас у двары...» (16+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ].
14.45, 15.25 Драма «Чужое шчасце» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Сэнс жыцця (12+).
17.30 «Маршрут пабудаваны» (12+).
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
22.50 Драма «Дрэнная суседка» (12+).
1.00 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 17.50 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.10 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.15 Серыял «Браты па крыві-2» (16+).
13.15 «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
13.45 Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).
14.45 «Арол і рэшка. Цуды свету-3» (16+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Вежа» (12+).
17.55 «На нажах» (16+).
18.55 «Клон». Серыял (16+).
20.00, 21.15 «Тата папаў» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36 , КЕНА.
22.20 «Вяселле ўсляпую» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 19.40, 22.55 Навіны культуры.
8.25 «Сляды на вадзе». Маст. фільм (16+) [СЦ].
10.00 «Камертон».
10.25, 18.00 «Замах». Шматсерыйны маст. фільм (16+) [СЦ].
12.15 «Сіла веры».
12.45 «Сваімі словамі».
13.20 «Бальная сукенка». Маст. фільм (6+) [СЦ].
14.40 «Кадры жыцця».
15.30 «Людзі на балоце». Маст. фільм (12+) [СЦ].
20.00 «Люблю і памятаю».
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «У жніўні 44-га...» Маст. фільм (12+) [СЦ].
23.10 «Маёр Ветраў». Шматсерыйны маст. фільм (16+) [СЦ].

Беларусь 5

7.00 Азбука спорту.
7.15, 17.30 Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе.
9.25 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
10.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Эвертан».
12.55 Аўтаспорт. Экстрым-Е. Відэачасопіс.
13.30 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестэр» — «Тотэнхэм».
15.30 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
16.05 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
19.20, 22.20 Гандбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
21.05 Спорт-цэнтр.
21.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
23.55 Фігурнае катанне. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 0.20 Фільм «Цешчыны бліны» (16+).
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Трывожная кнопка» (16+).
16.45, 18.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
18.50 «Поле цудаў» (16+).
20.00 Час.
21.15 «Лепш за ўсіх!» (0+)
22.55 «Што? Дзе? Калі?» (16+)

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.05 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.00 «Глядзець усім!» (16+)
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.25, 21.00, 0.55 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 21.45 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.30, 16.50 «Растоў». Серыял (16+).
20.30, 23.15 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Міншчына».

МІР

7.35, 10.20 Серыял «Даішнікі» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 3.00, 4.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
13.20 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.20, 17.10 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
18.25 «Сусветныя гульні розуму».
19.15 «Слабае звяно» (12+).
20.10 Маст. фільм «Сцеражыся аўтамабіля» (6+).
21.55 Маст. фільм «Вакзал для дваіх» (12+).
0.35 Маст. фільм «Ахоўнік для дачкі» (16+).
2.20, 3.15, 4.15 Мір. Меркаванне (12+).
2.30 Спецыяльны рэпартаж (12+).
2.40 «Еўразія. Рэгіёны» (12+).
02.50 «Стартап па-еўразійску» (12+).
03.30 «5 прычын застацца дома» (12+).
03.40 «Нашы замежнікі» (12+).
03.50 «Легенды Цэнтральнай Азіі» (12+).
04.25 Маст. фільм «Табар сыходзіць у неба» (12+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
15.55, 17.15 Серыял «Кулагіны» (16+).
18.30 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
20.45 «Гумарына-2021» (16+).
22.30, 23.10 «Весялосці час» (16+).
0.15 Фільм «Гэтая жанчына да мяне» (12+).

НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.10, 8.20, 16.40, 19.50, 22.20, 23.30 Сёння. Галоўнае.
6.05 «Здароўе» (12+).
6.50 Сфера інтарэсаў.
7.25 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 22.25 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.25 Гісторыі выратавання (12+).
10.50 Серыял «Ляснік. Свая зямля» (16+).
13.20 Надзвычайнае здарэнне.
13.50 «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
14.45 «ДНК» (16+).
16.45 «Чакай мяне» (12+).
17.55 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
20.05, 22.55, 23.45 Фільм «Клерк» (16+).

8 канал

7.00, 14.25, 19.20, 21.05, 1.15 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Фарсаж. Гоншчыкі» (6+).
7.30, 14.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Камедыя «Хепі-энд» (12+).
9.15 Серыял «Няпал».
10.05 Баявік «На грэбні хвалі» (16+).
12.10 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
13.00 Серыял «Прыгожае жыццё» (16+).
14.35 Мультпарад. «Лэдзі Баг і Супер Кот» (6+).
15.00 «Хачу ў Парыж» (12+).
15.05 «Гатуй як шэф» (12+).
15.20 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
16.05 Серыял «Полдарк» (16+).
18.05 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).
18.30 Серыял «Навучы мяне жыць» (16+).
19.25 Серыял «Добры доктар» (16+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.10 Баявік «Хан Сола» (12+).
23.25 Трылер «Добры, дрэнны коп» (16+).

ВТБ

6.05, 7.00, 9.00 «Раніца з гумарам» (16+).
11.00, 22.30 «КВЗ. Панашаму» (16+).
12.00 «Наш рамонт» (16+).
12.40 Трылер «Ілюзіяніст» (12+).
14.50 «Уральскія пельмені» (16+).
15.55 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
17.00 Серыял «Івановы—Ивановы» (16+).
18.30 Серыял «Гранд» (16+).
20.00 Серыял «#Сеня-Федзя» (16+).
21.00 «Суперліга» (16+).
23.30 Камедыя «Сняданак у таты» (12+).
1.25 Серыял «Псіхалагіні» (16+).
2.20 Серыял «Метад Лаўровай» (16+).
4.10 Серыял «Маладзёжка» (16+).
5.00 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.20, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 «Правілы жыцця».
7.35, 17.20, 0.45 «Найвялікшыя вынаходкі чалавецтва». Серыял [СЦ].
8.35, 23.20 Колер часу.
8.45 Легенды сусветнага кіно.
9.10, 16.35 «Народжаная зоркай». Тэлесерыял.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 23.50 XX стагоддзе.
12.10, 2.25 Раман у камені.
12.40 Астравы [СЦ].
13.25 «Вялікія міфы. Ілія-да». Серыял.
13.55, 22.15 «Д'яблы». Маст. фільм [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
15.20 «Цяперашняе-мінулае. Пошукі і знаходкі». Серыял.
15.50 «Белая студыя».
17.20, 1.35 Легендарныя канцэрты. Давід Ойстрах, Генадзь Раждзественскі і Акадэмічны сімфанічны аркестр Маскоўскай філармоніі.
19.00 Урокі рускай. Чытанні.
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Правілы жыцця».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.50 «Вайна без грыму». Дак. фільм. [СЦ].
21.30 Улада факта.

Настальгія

6.00 «Аншлаг! Аншлаг!» (12+)
7.25, 13.10, 18.55 Маст. фільм «Мой лёс» (16+).
8.30 Фільм-канцэрт «Перад дальняй дарогай» (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
9.40, 11.00, 12.50, 15.40, 17.00, 21.40, 3.40 Музычная настальгія (12+).
10.00, 16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Эліта Краіны Саветаў» (16+).
14.30 Фільм-канцэрт «Ленінградскія акварэлі» (12+).
18.00 Фільм-канцэрт «З дазволу праграмы «Бенефіс» (12+).
20.15 «І жартам, і сур'ёзна» (16+).
23.00 «Навагодняе прадстаўленне» (12+).
0.00 Фільм-канцэрт «Выкраданне» (12+).
3.50 Мастацкі фільм «Целаахоўнік» (18+).
5.20 «Блеф-клуб» (16+).

EuroSport 1

2.00, 8.00, 9.00, 9.30 Біятлон. КМ. Мужчыны (6+).
2.45 Біятлон. КМ. Жанчыны (6+).
3.30, 4.15 КМ. Скі-крос (16+).
5.00, 10.30, 15.00, 15.55, 21.00, 21.55 Снукер. Сусветны Гран-пры (6+).
7.00 Кёрлінг. Адбор на зімовыя АГ. Пары (6+).
12.30 Скачкі на лыжах з трамплінаў. КМ. Мужчыны (16+).
13.45 Тэлечасопіс Eurosport Winter Pass #4 (16+).
14.15, 14.30 Тэлечасопіс «На грані» (16+).
14.45 Тэлечасопіс Winter Tracks #1 (16+).
20.00 Конны спорт. Турнір Вялікага шлема (6+).
21.50 Навіны (16+).

Кінакамедыя

1.40 Браты з Грымсбі (18+).
3.55 Небяспечны бізнес (18+).
5.50 Паляўнічыя на прывідаў (6+).
7.45 Як выйсці замуж за мільярдэра (18+).
9.35 Касталом (16+).
11.25 Еўратур (16+).
13.05 Таўстун на рынгу (12+).
15.00 Кракадзіл Дандзі-2 (6+).
17.10 Шэрлак Холмс (12+).
19.30 Твае, мае і нашы (6+).
21.05 Таткі без шкодных звычак (16+).
22.55 Паездка ў Амерыку (18+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.05 «Тры ў адным» (12+).
10.05, 4.10 «Перыскоп» (16+).
10.25 «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
12.00 «Знакі лёсу» (16+).
12.40, 18.00, 2.20 «Сляпая» (16+).
13.50, 19.10, 3.15 «Варажбітка» (16+).
15.00 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
15.40 «Цуд» (12+).
16.15, 1.30 «Містычныя гісторыі» (16+).
17.20 «Любоўная магія».
20.20 «Інсамнія» (16+).
21.35 «13» (16+).
22.50 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
0.50 «Лінія абароны» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.10, 5.50, 17.20, 18.05 Элементарна (16+).
6.35 Джобс: імперыя спакусы (12+).
9.00 Кілеры (16+).
10.45 Паляўнічы на галовы (16+).
12.45 1+1 (16+).
14.50 Чалавек даждж (16+).

19.00 Абаронца (16+).
21.10 Чалавек, які змяніў усё (16+).
23.35 Трэнер картар (12+).
1.55 Афёра Томаса Краўна (16+).
3.40 Буслы (6+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Стэндап пад прыкрыццём (16+).
7.20 Пятніца (16+).
8.55 Цвярозы кіроўца (16 +).
10.45 Цёмны свет (16+).
12.35 Цёмны свет: раўнавага (12+).
14.15 Праваднік (16+).
16.00, 16.55, 18.00, 18.55 Шэрлак у Расіі (16+).
19.55, 4.20 Недаравальны (16+).
22.00 Варашылаўскі стралок (16+).
23.45 Вартаўнік (16+).
1.30 Жыццё наперадзе (16+).
2.55 Праваднік (16+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.25, 6.50 Гульні розуму (16+).
7.15 Панарама 360 градусаў: разбурэнне аб'ектаў сусветнай спадчыны (16+).
8.10 Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
9.00 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала (16+).
9.55 Ледзяная дарога (16+).
10.45, 11.35, 22.05 Дзікі тунец (16+).
12.25, 16.40 Нападзенне на Пёрл-Харбар: хвіліна за хвілінай (16+).
13.15, 14.05 Аўта-SOS (16+).
14.55, 19.15, 20.05, 2.45 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.50 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
17.30 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
18.25, 18.50 Фабрыка ежы (16+).
21.00, 3.30 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
22.50 Таемная гісторыя (16+).
23.45 Рэальнасць ці фантастыка? (16+)
0.40 Х: пакаленне, якое змяніла свет (18+).
1.15, 2.00 Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
4.30, 4.55 Зона будаўніцтва (16+).
5.20, 5.35 Расплаўленыя грошы (16+).

Discovery

8.00, 7.35 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Паляўнічыя на склады (16+).
10.15, 10.40, 21.15, 21.40, 1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04 Як гэта ўстроена? (12+)
12.05 Прыз Earthshot: рамонт нашай планеты (12+).
13.00 Крушэнне «Эстоніі» (16+).
13.55, 14.50, 15.45 Што магло пайсці не так? (16+)
17.35 Выжыванне без купюр (16+).
18.30, 18.55 Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
19.25, 4.27 Хуткія і гучныя (12+).
23.05, 5.14 Голыя і напалоханыя (16+).
0.00, 6.01 Хроніка зававання Эверэста з Беарам Грылсам (12+).
0.55, 6.48 Мужчыны, жанчыны, прырода (16+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 16 снежня ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.35 Зона Х (16+).
9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).
10.50 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «А ў нас у двары...» (16+)
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25 Драма «Чужое шчасце» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Драма «Халодныя берагі» (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Адзін дзень (12+).
0.15 Сфера інтарэсаў.
0.55 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 17.50 Тэлебарометр.
9.05, 19.55 Серыял «Сляпая» (16+).
10.10, 0.20 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.15, 22.20 Серыял «Браты па крыві-2» (16+).
13.10 «Сямейныя гісторыі» (16+).
13.50, 21.15 Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).
14.55 «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Вежа» (12+).
17.55 «Арол і рэшка. Цуды свету-3» (16+).
18.55 «Клон». Серыял (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49 , КЕНА.

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 19.40, 22.35 Навіны культуры.
8.25, 16.00 «Абочына». Маст. фільм (12+) [СЦ].
9.55, 17.35 «Камертон».
10.25, 18.00 «Замах». Шматсерыйны Маст. фільм (16+) [СЦ].
12.45 «Сваімі словамі».
13.30 «Чалавек, які браў інтэрв'ю». Маст. фільм (12+) [СЦ].
15.00 «Кадры жыцця».
15.50 «Вясна ўвосень». М/ф (0+).
20.00 «Люблю і памятаю».
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «Чалавек, які браў інтэрв'ю». Маст. фільм (12+) [СЦ].
22.50 «Маёр Ветраў». Шматсерыйны Маст. фільм [СЦ].

Беларусь 5

7.00 Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. СКА-Мінск — «Мяшкоў-Брэст».
8.30 Між іншым.
8.50 Гандбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
10.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Брайтан» — «Вулверхэмптан».
12.20, 19.40 Фігурнае катанне. Гран-пры.
14.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Вест Хэм».
16.05, 20.45 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
17.30 Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе.
19.30, 22.10 Спорт-цэнтр.
22.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестэр» — «Тотэнхэм».

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30, 1.00** Нашы навіны.
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 23.5 Фільм «Цешчыны бліны» (16+).
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.55 Серыял «Знахар» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.10 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.00 «Глядзець усім!» (16+)
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.25, 21.00, 1.00 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 21.50 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.35, 16.50 «Растоў». Серыял (16+).
20.30, 23.15 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Міншчына».

МІР

5.00, 4.55 Серыял «Шчаслівы білет» (16+).
7.40, 10.10, 21.55 Серыял «Дашнікі» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.55, 3.00 Навіны (бягучы радок).
13.20 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.20, 18.05 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.10 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25 «Гульня ў кіно» (12+).
20.10 «Слабае звяно» (12+).
21.05 «Назад у будучыню» (16+).
0.00 Дак. фільм «Незалежнасць. Місія выканальная» (16+).
0.35 Маст. фільм «Табар ідзе ў неба» (12+).
2.15, 3.15 Мір. Меркаванне (12+).
2.25 «Зроблена ў Еўразіі» (12+).
2.35 «Нашы замежнікі» (12+).
2.45 «5 прычын застацца дома» (12+).
2.55 Мір. Спорт (12+).
3.25 Спецыяльны рэпартаж (12+).
3.35 «Даслоўна» (12+).
3.45 «Еўразія. Рэгіёны» (12+).
3.55 Маст. фільм «Дзяўчына спяшаецца на спатканне» (12+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
15.55, 17.15 Серыял «Кулагіны» (16+).
18.30 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Таямніцы следства-21» (16+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.10, 8.20, 16.40, 19.50, 22.20, 23.30 Сёння. Галоўнае.
6.05 «Здароўе» (12+).
6.50 Сфера інтарэсаў.
7.25 «Маршрут пабудаваны» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 22.25 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.25 Гісторыі выратавання (12+).
10.50 Серыял «Ляснік. Свая зямля» (16+).
13.20 Надзвычайнае здарэнне.
13.50 «За гранню» (16+).
14.45 «ДНК» (16+).
16.45 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
20.05, 22.45, 23.45 Серыял «Пяць хвілін цішыні. Сімбірскія маразы» (12+).

8 канал

7.00, 14.25, 17.45, 21.05, 00.55 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Фарсаж. Гоншчыкі» (6+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Баявік «Чалавек з залатым пісталетам» (16+).
9.40 Серыял «Бразілія».
10.25 Вестэрн «Строга на Захад» (16+).
12.05 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
12.55 Серыял «Прыгожае жыццё» (16+).
14.30 Мультпарад. «Лэдзі Баг і Супер Кот» (6+).
14.50 «Хачу ў Парыж» (12+).
15.00 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
15.50 Серыял «Полдарк» (16+).
17.50 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).
18.30 Серыял «Навучы мяне жыць» (16+).
19.20 Серыял «Добры доктар» (16+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.10 Драма «Шлюб па-італьянску» (16+).
23.00 Трылер «Лінкальн для адваката» (16+).

ВТВ

6.05, 7.00, 9.00 «Раніца з гумарам» (16+).
11.00 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
12.00 «Гатуем як шэф» (16+).
12.35 «Дурні і дарогі» (16+).
12.50 Камедыя «Сняданак у таты» (12+).
14.50 «Уральскія пельмені» (16+).
15.55 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
17.00 Серыял «Івановы—Ивановы» (16+).
18.30 Серыял «Гранд» (16+).
20.00 Серыял «#СеняФедзя» (16+).
21.00 «Форт Баярд» (16+).
23.00 Камедыя «Усё і адразу» (16+).
0.55 Серыял «Псіхалагіні» (16+).
2.20 Серыял «Метад Лаўровай» (16+).
4.10 Серыял «Маладзёжка» (16+).
5.00 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.20, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 «Правілы жыцця».
7.35, 18.20, 1.05 «Найвялікшыя вынаходкі чалавецтва». Серыял [СЦ].
8.35, 19.10 Колер часу.
8.45 Легенды сусветнага кіно.
9.10, 16.35 «Народжаная зоркай». Тэлесерыял.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 23.50 XX стагоддзе.
12.30 «Страсці па Шчадрыне». Дак. фільм.
13.25 «Вялікія міфы. Ілія-да». Серыял.
13.55, 22.15 «Д'яблы». Маст. фільм [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
15.20 «Цяперашняе-мінулае. Пошукі і знаходкі». Серыял.
15.50 «2 Вернік 2».
17.20, 2.00 Легендарныя канцэрты. Дзмітрый Хвастоўскі, Алег Башняковіч.
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Правілы жыцця».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 «Нябесныя ластаўкі». Мая мілая Бабета! Дзіўна гэта, дзіўна гэта!» Дак. фільм [СЦ].
21.30 «Энігма. Юджа Ванг».

Настальгія

6.00 «Эліта Краіны Саветаў» (16+).
6.50, 9.40, 11.00, 15.40, 21.40, 23.00, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.10, 12.55, 1.25 Мастацкі фільм «Мой лёс» (16+).
8.30 Фільм-канцэрт «Ленінградскія акварэлі» (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 Фільм-канцэрт «З дазволу праграмы «Бенефіс» (12+).
14.15 «І жартам, і сур'ёзна». Сатырычная праграма (16+).
17.00 «Навагодняе прадстаўленне» (12+).
18.00 Фільм-спектакль «Вялікая магія» (12+).
20.25 Фільм-канцэрт «Сумаваць не трэба» (12+).
23.20 «Блеф-клуб» (16+).
0.00 «Аншлаг! Аншлаг!» (12+)
2.30 Фільм-канцэрт «Перад дальняй дарогай» (12+).

EuroSport 1

2.00, 11.00 Тэлечасопіс GolfTV Weekly (6+).
2.30 Скачкі на лыжах з трамплінаў. КМ. Мужчыны (16+).
3.30 Горныя лыжы. КМ. Жанчыны (16+).
4.30, 13.45 Горныя лыжы. КМ. Мужчыны (16+).
5.00, 17.30, 21.05, 21.55 Снукер. Сусветны Гран-пры (6+).
7.00, 7.30 Лыжнае двааборʼе. КМ. Мужчыны (6+).
8.00, 9.00, 10.00, 15.15, 16.05, 20.05 Біятлон. КМ. Жанчыны (6+).
10.30 Біятлон. КМ. Мужчыны (6+).
11.30 Конны спорт. Турнір Вялікага шлема (6+).
12.30 Тэлечасопіс Eurosport Winter Pass #4 (16+).
13.00, 13.15 Тэлечасопіс «На грані» (16+).
13.30 Тэлечасопіс Winter Tracks #1 (16+).
20.00, 21.50 Навіны (16+).

Кінакамедыя

1.10 Прышэльцы (12+).
3.50 Вар'яцкія суседзі (16+).
5.25 Хлопец з нашых могілак (12+).
7.05 Дзядуля лёгкіх паводзін (18+).
9.00 Шэрлак Холмс (12+).
11.20 Кракадзіл Дандзі (12+).
13.10 Зялёная кніга (16+).
15.35 Твае, мае і нашы (6+).
17.10 Шэрлак Холмс: гульня ценяў (12+).
19.30 Куленепрабівальны (12+).
21.20 Прасунуты (16+).
23.00 Ілюзія падману (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.50 «Тры ў адным» (12+).
9.50 «Улегцы» (12+).
10.30 «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
12.00 «Знакі лёсу» (16+).
12.40, 18.30, 2.20 «Сляпая» (16+).
13.50, 19.40, 3.15 «Варажбітка» (16+).
14.55, 5.35 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
15.35 «Цуд» (12+).
16.15, 1.30 «Містычныя гісторыі» (16+).
17.20 «Любоўная магія».
20.50 «Крымінальныя сувязі зорак» (16+).
21.45 «13» (16+).
23.00 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.00 «10 самых» (16+).
4.05 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.05, 5.45, 17.20, 18.05 Элементарна (16+).
6.30 Маленькі Манхэтэн (12+).
8.05 Абаронца (16+).
10.20 Чалавек, які змяніў усё (16+).
12.45 Трэнер картэр (12+).
15.15 Афёра Томаса Краўна (16+).
19.00 Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана (16+).
22.00 Дзённік памяці (16+).
0.10 Жонка падарожніка ў часе (16+).
2.20 Чалавек даджу (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Вартаўнік (16+).
8.40, 20.00 Хлопец з нашых могілак (12+).
10.15, 4.40 Выкрутасы (12+).
12.05 Варашылаўскі стралок (16+).
13.55 Недаравальны (16+).
16.00, 16.55, 18.00, 18.55 Шэрлак у Расіі (16+).
21.35 Здань (6+).
23.35 Напарнік (12+).
1.20 Тэрмінова выйду замуж (16+).
3.00 Нявеста любой цаной (16+).

National Geographic

6.00, 6.30 Гульні розуму (16+).
6.50 Панарама 360 градусаў: разбурэнне аб'ектаў сусветнай спадчыны (16+).
7.45 Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны (16+).
8.40 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'ядноўвае (16+).
9.30 Ледзяная дарога (16+).
10.20, 11.10 Дзікі тунель (16+).
12.00, 16.30 Дзікі тунель: Поўнач супраць Поўдня (16+).
13.00, 13.55 Аўта-SOS (16+).
14.45, 19.15, 20.05, 2.45 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.35 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
17.30, 21.50 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
18.25, 18.50 Фабрыка ежы (16+).
21.00, 3.35 Нязведаныя воды з Джэрэмі Уэйдам (16+).
22.40 Тайная гісторыя (16+).
23.35 Рэальнасць ці фантастыка? (16+)
0.30 Х: пакаленне, якое змяніла свет (18+).
1.15, 2.00 Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
4.25, 4.50 Зона будаўніцтва (16+).
5.10, 5.35 Расплаўленыя грошы (16+).

Discovery

8.00, 7.35 Як гэта зроблена? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Паляўнічыя на склады (16+).
10.15, 10.40, 13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10 Як гэта ўстроена? (12+)
12.05 Голыя і напалоханыя (16+).
13.00 Хроніка зававання Эверэста з Беарам Грылсам (12+).
17.35 Выжыванне без купюр (16+).
18.30 Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
19.25, 4.27 Хуткія і гучныя (12+).
23.05, 0.00, 0.55, 5.14, 6.01, 6.48 Залатая ліхаманка (16+).
1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04 Багажныя войны (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

«Самае галоўнае — работа з людзьмі, выслухаць іх, данесці ім праўду»

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Было падкрэслена, што некаторыя паўторныя звароты выкліканы халатным стаўленнем да сваіх службовых абавязкаў некаторых чыноўнікаў. У сувязі з гэтым 47 службовых асоб прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці.

Большасць зваротаў жыхароў рэгіёна датычыцца пытанняў рамонту і эксплуатацыі жылля, добраўпарадкавання дарог і тэрыторый. Звяртаюцца і з праблемамі пракладкі інжынерных сетак, атрымання крэдытаў, выкарыстання сродкаў мацярынскага капіталу.

Дарэчы, у тых жа жыллёвых праблемах намецілася тэндэнцыя да зніжэння зваротаў у параўнанні з мінулым годам. А вось на першае месца выходзяць пытанні добраўпарадкавання двароў, вуліц, дарог і ў цэлым населеных пунктаў. У сваю чаргу мясцовымі органамі ўлады робіцца нямала. Былі агучаны такія факты: адрамантавана каля 130 тысяч квадратных метраў вулічна-дарожнага палатна, высаджана 17 тысяч дрэў і кустарнікаў, адрамантавана каля 700 прыдомавых тэрыторый, 460 дзіцячых пляцовак. Але гэта тэма па-ранейшаму самая актуальная ў звароце жыхароў Гродзенскай вобласці. З такім фактам сутыкнулася падчас прыёму грамадзян і Наталля Качанава.

— Да мяне на прыём прыйшла жанчына з Наваельні, у нас адбылася добрая размова. Яна сказала, што любіць свой пасёлак, але ён не зусім добраўпарадкаваны. Старшыня аблвыканкама абяцаў, што з'ездзіць і разбярэцца з гэтымі пытаннямі. Добра, што людзі клапоцяцца аб сваім наваколлі, хочуць, каб вакол было прыгожа, — зазначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

Была агучана заўвага, што не ўсе праблемы па добраўпарадкаванні могуць вырашацца на месцах. Некаторыя патрабуюць рэгулявання на заканадаўчым узроўні. Напрыклад, пракладка дарог у мікрараёнах індывідуальнай

Фота БелТА

забудовы. Каб пракласці метр палатна, неабходна патраціць каля 6 мільёнаў рублёў, значная частка сродкаў — гэта праектныя работы. Хоць ёсць і больш простае рашэнне: падключыць да гэтай работы саміх жыхароў. Менавіта такі кірунак павінен атрымаць далейшае развіццё.

— Гэтыя пытанні павінны заставацца на кантролі мясцовых органаў улады, — зазначыла Наталля Качанава. — Між тым мы прыйшлі да высновы, што для іх вырашэння трэба больш актыўна выкарыстоўваць механізмы дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Людзі таксама павінны быць зацікаўлены, каб іх двор, вуліца былі ў належным стане. Неабходна для гэтага задзейнічаць і патэнцыял грамадскіх арганізацый, у тым ліку дваровых камітэтаў, саветаў. Такая форма ўзаемадзеяння эфектыўная.

На яе думку, ёсць неабходнасць замацаваць гэтыя пытанні на заканадаўчым узроўні. Гэта ў большасці якраз і з'яўляецца работай дэпутацкага корпуса.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ДАРОГІ, ПАДАТКІ, ЗАРПЛАТЫ...

Міхаіл РУСЫ правёў прыём грамадзян у Навагрудку

Да старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні са сваімі праблемамі, якія датычыліся самых розных сфер, прыйшлі не толькі жыхары Навагрудчыны, але і іншых рэгіёнаў краіны.

На сустрэчу запісалася больш за 10 чалавек. Кола пытанняў датычылася рамонту мясцовых дарог і шматпавярховых дамоў, даступнасці гандлёвага абслугоўвання і памеру падаткаў, своечасовасці разліку з работнікамі і іншага.

У прыватнасці, былыя работнікі фабрыкі спецадзення прыйшлі на прыём да сенатара са сваёй бядой: летась у сакавіку яны звольніліся з прадпрыемства з прычыны яго закрыцця, але разліку няма да гэтага часу. Змяніўся ўласнік, а запазычанасці засталіся.

Міхаіл Русы пераканаў, што вырашыць праблему трэба як мага хутчэй:

— Заработная плата — гэта аснова. Пытанне неабходна ўзяць на кантроль, адпаведным органам — разабрацца і прыняць неабходныя меры, — падкрэсліў сенатар.

На прыём у Навагрудак са сталіцы прыехала шматдзетная сям'я з пытаннем правядзення рамонтных работ у шматпавярховым доме. На думку старшыні профільнай камісіі, праблему трэба вырашаць неадкладна, адпаведнае даручэнне ўжо дадзена з тым, каб забудоўшчык ліквідаваў усе недахопы і прывёў дом у належны стан.

Цікавы выпадак расказала сенатару жыхарка Навагрудка: яна — інвалід II групы, мае ва ўласнасці дзве машыны (легкавік і мікрааўтобус), але правоў кіравання не мае. На легкавым аўто — у паліклініку, а на «бусе» — у грыбы-ягады яе возіць суседка. Тым часам падатак за валоданне двума транспартнымі сродкамі ёй плаціць давядзецца. «Што рабіць?» — пытаецца заяўніца.

— Па новым заканадаўстве льготы па аплаце транспартнага падатку прадугледжаны толькі для інвалідаў, якія маюць правы кіроўцы, — растлумачыў Міхаіл Русы. — Раённы выканаўчы камітэт можа прыняць рашэнне аб прымяненні льгот па транспартным падатку толькі ў тым выпадку, калі ў чалавека складаная сітуацыя. У пытанні трэба разабрацца, аднак закон ёсць закон, і ён для ўсіх адзін.

З калектыўнай просьбай працягнуць маршрут гарадскога аўтобуса прыйшло некалькі жыхароў райцэнтра. Яны растлумачылі, што аўтобус не даязджае да іх садовага таварыства літаральна 600 метраў, а для пажылых — гэта адлегласць.

Як удакладніў **старшыня Навагрудскага райвыканкама Сяргей ФЕДЧАНКА,** прыведзенае пытанне ўжо вывучалася: неабходна ўладкаваць разваротную пляцоўку і скарэкціраваць маршрут. Ён паабяцаў, спецыялісты выедуць на месца і яшчэ раз усё вывучаць.

— Людзі падымаюць шырокі спектр пытанняў: і жыллёвае будаўніцтва, і добраўпарадкаванне, і транспартны падатак, і дарогі, — адзначыў сенатар. — Вядома ж, кожнае пытанне будзе ўзята на кантроль і даведзена да лагічнага завяршэння. Пры гэтым заўсёды варта ўлічваць эканамічную мэтазгоднасць, усё павінна быць разумна. Кожнага чалавека важна выслухаць, калі трэба, растлумачыць і паясніць.

Ён лічыць правядзенне такіх прыёмаў эфектыўным і неабходным для людзей.

— Дзякуючы ім пры прыняцці законаў, аналізе выканання заканадаўчых, нарматыўна-прававых актаў мы бачым, што практыка прымянення ці не тая, ці ёсць недапрацоўкі — а гэта людзі, іх праблемы і жыццёвыя сітуацыі. І пры чарговай карэкціроўцы ёсць рэальная магчымасць зняць тыя пытанні. Самае важнае, што кожны прыём — гэта дапамога людзям, магчымасць убачыць сітуацыю на месцах, — рэзюмаваў Міхаіл Русы.

Вольга АНУФРЫЕВА, фота «Новае жыццё».

РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ правёў прыём грамадзян у Ашмянах. Райцэнтр мяжуе з Літоўскай Рэспублікай. Такая тэрытарыяльная блізкасць і стала нагодай для аднаго з пытанняў, агучанага сенатару.

Да яго з рознымі праблемамі і прапановамі звярнуліся пяць чалавек. Адзін з заяўнікаў прапанаваў унесці змяненні ў зямельнае заканадаўства, бо не можа з братам падзяліць зямлю, якая дастаецца ім у спадчыну. З хатай, што засталася ад бацькоў, браты разабраліся, падзяліўшы яе ў роўных долях, а вось з участкам на шэсць сотак на юрыдычным узроўні аказалася не ўсё так проста. **Старшыня райвыканкама Уладзіслаў ГЕРШГОРЫН** вырашыў дапамагчы сваякам знайсці агульную мову, запрасіўшы братоў да сябе на прыём, каб у дыялогу яны дасягнулі кансэнсусу.

Яшчэ адна заяўніца — жыхарка райцэнтра — звярнулася з праблемай неабходнасці правядзення рамонту хлява і з надворнай прыбіральні ў арэндным жыллі, дзе яна жыве. Гэтую тэму возьме на кантроль **намеснік старшыні**

райвыканкама Андрэй КЛЫШЭЎСКІ, які курыруе сферу будаўніцтва. Ён запэўніў, што праблема будзе вырашана ў двухтыднёвы тэрмін.

Пенсіянерка з Літвы, якая мае пасведчанне на права жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, задала сенатару пытанне аб магчымасці перагледзець яе пенсію згодна з беларускім заканадаўствам. Таксама жанчына, інвалід другой групы па агульным захворванні, цікавілася магчымасцю кампенсацыі выдаткаў на карыстанне электраэнергіяй у дачным доміку ў адной з вёсак раёна. Як растлумачылі заяўніцы, на 40-працэнтнае пакрыццё расходаў могуць разлічваць ільготнікі з ліку грамадзян Беларусі. Што датычыцца атрымання беларускай пенсіі, на яе жанчына таксама прэтэндаваць не можа, бо не мае ніводнага дня працоўнага стажу ў нашай краіне.

Як расказаў Сяргей Рачкоў пасля прыёму грамадзян, галоўная задача такіх візітаў у рэгіён — выслухаць, паглядзець, чым сенатары могуць дапамагчы на заканадаўчым узроўні, звярнуцца ў адпаведныя органы ўлады, для таго каб вырашыць праблему кожнага, хто звяртаецца.

— Вядома, мы імкнёмся аказаць такую дапамогу ў рамках дзеючага заканадаўства і нарматыўна-прававых актаў, — падкрэсліў спікер. — Самае важнае, што людзі прыйшлі на гэтую сустрэчу. Значыць, яны давяраюць уладзе. І яны ведаюць, што беларускія чыноўнікі адгукаюцца на просьбы, звароты і заявы. Сёння на прыёме былі паднятыя розныя пытанні. Некаторыя з іх складана вырашыць, асабліва тыя, што датычацца ўзаемаадносін паміж сваякамі, калі людзі не могуць падзяліць спадчыну ў адпаведнасці з законам. Я заўсёды знаходжу разуменне ў старшыняў райвыканкамаў, калі прашу паспрабаваць з чалавечага пункту гледжання вырашыць тую ці іншую сітуацыю на карысць сям'і ці асобна ўзятага грамадзяніна.

Таксама ён звярнуў увагу на тэрытарыяльныя асаблівасці гэтага рэгіёна:

— Ашмяны — прыгранічны рэгіён, таму нядзіўна, што ад грамадзян паступаюць пытанні, якія даводзіцца вырашаць згодна з міжнароднымі пагадненнямі з Літоўскай Рэспублікай, у тым ліку і ў галіне сацыяльнага забеспячэння. Часам людзі не ведаюць, хто можа ім дапамагчы: улады Літвы ці Беларусі. І мы заўсёды стараемся растлумачыць спрэчныя моманты, бо людзі, якія звярнуліся, прыехалі жыць на нашу, беларускую зямлю.

Пасля прыёму грамадзян старшыня профільнай камісіі завітаў на сыраробны завод і ААТ «Белкава», каб пазнаёміцца з умовамі працы, сацыяльным пакетам для людзей, што працуюць на згаданых прадпрыемствах, пачуць іх думкі, прапановы напярэдадні ўсенароднага абмеркавання праекта Асноўнага Закона краіны.

Вольга АНУФРЫЕВА, фота «Ашмянскі веснік».

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

ВЕЛАСІПЕДЫ, ЦЁПЛЫЯ ШКАРПЭТКІ І ХАТНІЯ ПРЫСМАКІ

Магілёўскі інстытут МУС даў старт марафону добрых спраў

Калі дакладна, то гэта хутчэй працяг эстафеты, бо тут існуе традыцыя дапамагаць на працягу года тым, хто знаходзіцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Па словах начальніка ВНУ генерал-маёра Валерыя ПАЛІШЧУКА, для будучага афіцэра, які стаіць на варце інтарэсаў грамадства, гэта асноўнае правіла. Як сенатар ён апякуе ў Магілёўскай вобласці Мсціслаўскі, Дрыбінскі і Горацкі раёны.

Гэтым разам нагодай для візітаў стаў Міжнародны дзень інвалідаў. Для аддзялення кругласутачнага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў у аграгарадку Пудаўня Дрыбінскага раёна былі закуплены інвалідная каляска і іншыя патрэбныя ў бытавым карыстанні прадметы, пастаяльцам дома-інтэрната для пажылых людзей і інвалідаў у пасёлку Андраны Мсціслаўскага раёна перададзены цёплыя рэчы і хатнія кансервы, а шматдзетная сям'я Жукавых з Пудаўні атрымала тры ровары і салодкія падарункі. Удзел у акцыі па зборы цёплых рэчаў і прадуктаў харчавання бралі як выкладчыкі інстытута, так і курсанты. Хтосьці перадаваў вязаныя шкарпэткі, нехта — слоік з варэннем. У справах дабрачыннасці важна прасякнуцца духам міласэрнасці, абудзіць у душы патрэбную гаму. Эмоцыі застануцца і замацуюцца. Па сутнасці, увагай адной установы было ахоплена каля 140 чалавек. Валерый Палішчук заўсёды на сувязі з кіраўніцтвам сацыяльных устаноў і бацькамі шматдзетнай сям'і з Пудаўні. Тыя ж ровары — гэта пажаданне дзяцей, бо іх у сям'і восем, а ровар быў адзін.

— Сёння мы аказалі дапамогу пажылым людзям і шматдзетнай сям'і, а ў хуткім часе запланавана нямала мерапрыемстваў, дзе мы павіншуем з надыходзячымі святамі ўсіх тых, хто чакае нашай дапамогі, — адзначыў сенатар. — Пачуццё адказнасці, традыцыі афіцэрства, неабходнасць паставіць плячо ў патрэбны момант і аказаць дапамогу — на такіх прынцыпах мы выхоўваем нашых курсантаў. А яны ўжо па ланцужку перадаюць гэтыя паняцці іншым.

Напярадзе яшчэ шмат дабрачынных візітаў да тых, з кім установа падтрымлівае пастаянныя сувязі і каму патрэбнае садзейнічанне. Сярод іх — былы супрацоўнік інстытута, які мае інваліднасць, — Дзяніс Варэннікаў. Для яго сабраны грошы, якія пойдуць на набыццё дарагіх сродкаў медыцынскага догляду. А яшчэ адзінокая пенсіянерка Вольга Еўдакімаўна Пахоменка. Прадстаўнікі інстытута МУС наведаюць таксама сацыяльныя ўстановы, шматдзетныя сем'і і дзіцячыя цэнтры рэабілітацыі ў Горацкім, Магілёўскім і Мсціслаўскім раёнах.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота Марыны ГРАМЫКІ.

Наталля КАЧАНАВА:

«У любой рабоце не павінна быць фармалізму»

Раўнадушша людзі адразу адчуваюць

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася з прадстаўнікамі Маладзёжнага парламента Лёзненскага раёна, створанага пры мясцовым райсавеце дэпутатаў.

Фота БелТА.

Днямі спікер верхняй палаты парламента правяла сустрэчу з моладдзю Віцебшчыны — у Савет Рэспублікі завіталі маладыя людзі, якія вучацца і працуюць у Лёзненскім раёне. Тэмы закраналіся самыя розныя: ад заканатворчасці да арганізацыі работы з насельніцтвам.

— Мы вельмі рады, калі да нас прыязджаюць у Савет Рэспублікі, — прывітала гасцей Наталля Качанава. Яна пазнаёміла маладых людзей, большасць з якіх упершыню апынулася тут, са структурай верхняй палаты парламента, сутнасцю яго дзейнасці.

Спікер расказала аб створаным па даручэнні кіраўніка дзяржавы экспертным савеце на базе Савета Рэспублікі, дзе адпрацоўваюцца ўсе прыманыя на заканадаўчым узроўні нарматыўныя прававыя акты.

— У краіне дзейнічае каля трох тысяч законаў, яны прымаліся ў розны час, зразумела, што патрабуюцца дапаўненні і змяненні, — растлумачыла яна. — Распрацоўка новых законапраектаў ідзе пастаянна. Цяпер мы падрыхтавалі план работы над законапраектамі на 2022-і.

Спікер звярнула ўвагу на важнасць такіх сустрэч, бо, менавіта працуючы над законапраектамі, парламентарыі павінны разумець іх актуальнасць і своечасовасць. Сёлета, расказала яна, у фокусе ўвагі заканадаўцаў знаходзіліся Кодэкс аб адукацыі, законы аб дзяржаўнай службе і спорце.

— Наогул, тэматыка абсалютна рознабаковая і па розных кірунках, — адзначыла яна і звярнула ўвагу на тым, што парламентарыямі праводзіцца грунтоўная падрыхтоўчая работа, дзеля таго каб законапраекты служылі пэўны час і не даводзілася іх карэкціраваць.

Прыгадала яна і леташнюю сітуацыю, якая прадэманстравала неабходнасць заканадаўчых змяненняў у Адміністрацыйны і Крымінальны кодэксы. Акрамя таго, супрацьстаяць скажэнню гістарычнай праўды аб Вялікай Айчыннай вайне і, адпаведна, садзейнічаць распрацоўцы закона аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму, унясенні змяненняў і дапаўненняў у закон аб экстрэмізме. Не абмінула Наталля Качанава і тэму распрацоўкі змяненняў у Асноўны Закон краіны:

— У найбліжэйшы час праект будзе прапанаваны кіраўніку дзяржавы, а далей — разглядацца на ўсенародным абмеркаванні.

Сярод навацый: адзіны дзень галасавання за дэпутатаў усіх узроўняў, пачынаючы ад народных абраннікаў у пасялковыя Саветы і заканчваючы дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў.

— Прапануецца тэрмін іх паўнамоцтваў замацаваць на пяць гадоў, — удакладніла Наталля Качанава.

Спынілася спікер верхняй палаты парламента і на адным з найважнейшых аспектаў дзейнасці ўсіх дэпутатаў — рабоце з людзьмі.

— У нашай рабоце, як і ў любой, не павінна быць фармалізму, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Усюды мусіць быць ініцыятыва, праяўляцца цікавасць, бо фармалізм і раўнадушша людзі заўсёды адчуваюць. І гэта ставіць на рабоце вялікі крыж, а такога дапускаць нельга.

Яна падкрэсліла: менавіта дзякуючы жывым зносінам выбудоўваецца разуменне таго, што неабходна зрабіць ці змяніць, каб жыццё людзей на канкрэтнай тэрыторыі паляпшалася. У якасці прыкладу Наталля Качанава прывяла ініцыятыву дэпутатаў аб вылучэнні на конкурснай аснове бюджэтных сродкаў на задавальненне прапаноў і ініцыятыў грамадзян, з якімі яны звяртаюцца да ўлады, напрыклад, па добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый, азеляненні і пабудове гульнявых дзіцячых пляцовак:

— Гэтая ідэя была падтрымана Прэзідэнтам, — расказала яна. — Сёлета ўжо вылучаліся сродкі, і налета гэта будзе дзейнічаць так, як прапанавалі дэпутаты. Не думайце, што ўсё ідзе зверху, прапановы і ідэі ідуць знізу — з рэгіёнаў.

Са свайго боку, маладыя людзі адзначылі важнасць і выніковасць падобных сустрэч.

Ніл Картошкін, вучань 11 класа СШ № 1 гарпасёлка Лёзна, адзначыў, што адкрытая размова са спікерам верхняй палаты парламента дае вялікі багаж ведаў, які прадстаўнікі рэгіянальнага Маладзёжнага парламента возьмуць адсюль. Ён даў ацэнку сучаснай моладзі, якой далёка не ўсё роўна, што адбываецца навокал:

— Моладзь цяпер вельмі актыўная, магу прывесці як прыклад наш Маладзёжны парламент: у нас не было ніводнага пасяджэння, на якім мы б не абмяркоўвалі, што можна зрабіць для пасёлка. І мы будзем рабіць усё, каб не толькі наш гарадскі пасёлак, але і ўся Беларусь квітнела, — кажа хлопец. — Трэба абстрагавацца ад таго, што навязваецца адносна новых тэхналогій, нам патрэбныя чыстае паветра, яснае неба над галавой і зносіны з разумнымі, адукаванымі і культурнымі людзьмі.

> Спікер звярнула ўвагу на важнасць такіх сустрэч, бо, менавіта працуючы над законапраектамі, парламентарыі павінны разумець іх актуальнасць і своечасовасць. Сёлета, расказала яна, у фокусе ўвагі заканадаўцаў знаходзіліся Кодэкс аб адукацыі, законы аб дзяржаўнай службе і спорце.

Кірыл Гайкоў, адзінаццацікласнік той жа школы, таксама адзначыў цікавы і каштоўны досвед, атрыманы сёння.

— Хачу сказаць, што цяпер у моладзі ёсць магчымасць быць пачутай, — падкрэсліў юнак і акцэнтаваў увагу на ініцыятыўнасці маладога пакалення. — У нас шмат ідэй і ініцыятыў. Напрыклад, у нас былі два праекты, якія перамаглі на рэспубліканскім узроўні.

Хлопец падкрэсліў, што як грамадзянін сваёй краіны ён прыкладзе ўсе намаганні, каб Беларусь заставалася такой жа прыгожай, суверэннай і незалежнай краінай.

Вольга АНУФРЫЕВА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 9 снежня 2021 года.**

Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ:

«ЖУРНАЛІСТЫКА — ГЭТА МАЁ ЖЫЦЦЁ!»

У адыходзячым годзе Вольга Шпілеўская ўзначаліла прадстаўніцтва Міжнароднай тэлерадыёкампаніі «Мір» у нашай краіне. Пасада ганаровая, але ў той жа час вельмі адказная: паказваць і расказваць пра сапраўднае жыццё Беларусі за яе межамі.

Аб перспектывах сучаснага тэлебачання, аўтарскай журналістыкі, крыніцах натхнення і традыцыях святкавання Новага года Вольга Аляксандраўна, як і належыць прафесійнаму журналісту, расказала вельмі падрабязна і смачна.

— Вольга Аляксандраўна, практычна ўся ваша прафесійная дзейнасць звязана з журналістыкай. Ці можна сказаць, што гэта ваш лёс?

— Гэта больш, чым лёс. Гэта жыццё! Здарылася так, што я прыйшла працаваць у навіны ў 1994 годзе. Гэта быў другі курс журфака. Па сутнасці, усё маё жыццё звязана з навінамі. Ці выбірала я прафесію свядома, сказаць складана. Але зараз я не ўяўляю, што тады магла абраць іншае. Я хацела на журфак заўжды. І так атрымалася, што маё першае знаёмства з прафесіяй адбылося на радыё, на вуліцы Чырвонай. Гэта была творчая практыка, якая дала магчымасць паступіць на журфак. На радыё я рабіла сюжэты. Памятаю, як першы раз пачула свой голас, запісаны на бабіну... Гэта была не я! *(Смяецца.)*

— З якой дзейнасці непасрэдна пачалося тэлебачанне ў вашым жыцці?

— Гэта была Камуністычная, 6, аддзел па апрацоўцы інфармацыі. Уявіце той час! Толькі пачалі з'яўляцца першыя камп'ютары. Нашай задачай было складаць блокі навін з інфармацыйных стужак ТАСС, «Інтэрфакса», якія потым выкарыстоўваліся на радыё і тэлебачанні. Наступным крокам стала Агенцтва тэленавін.

— Між тым перыядам і днём сённяшнім прайшло больш за 25 гадоў. За гэты час у тэлевізійным вяшчанні адбыўся вялізны скачок. Вы як прафесіянал у якіх кірунках найперш бачыце розніцу?

— Мне здаецца, журналістыка — прафесія, якая сёння развіваецца хутчэй за іншыя. Яшчэ ў 2000 годзе асноўная задача журналіста заключалася ў тым, каб знайсці інфармацыйную нагоду і здабыць інфармацыю, а не проста яе апрацаваць, не ўстаючы з крэсла. Табе трэба было акружыць сябе вялікай колькасцю знаёмых, крыніцамі інфармацыі, каб рабіць эксклюзіўныя матэрыялы. Ты ўвесь час знаходзішся ў руху. Цяпер, вядома, працаваць журналістам, з аднаго боку, прасцей, а з другога — складаней. У такіх вялізных патоках інфармацыі няпроста захаваць свой твар, стрыжань і стылістыку.

— Сапраўды сучасныя людзі перагружаны інфармацыяй. Як не разгубіцца ў гэтым патоку і зразумець, дзе праўда, а дзе фэйк?

— Прыйшоў час аўтарскай журналістыкі. У людзей з'явілася запатрабаванне ў пэўных асобах, у вачах і галасах. Давяраючы думцы аўтарытэтнага журналіста, чалавеку прасцей зразумець і больш глыбока прааналізаваць працэсы, якія адбываюцца ў краіне і ў свеце. Пажадана, каб гэта быў журналіст і палітолаг у адной асобе.

Пакуль аўтарская журналістыка ў нас не здарылася, яе месца на нейкі час занялі блогеры. Асабліва яскрава гэта было заўважна ў 2020 годзе. Але потым людзі стаміліся ад бясконцых патокаў інфармацыі і знайшлі таго, каму можна давяраць і за кім можна ісці. Прыйшоў час Рыгора Азаронка, Яўгена Пуставога, Ігара Тура. На мой погляд, чалавек, які свядома ідзе ў аўтарскую журналістыку, абавязаны, як лекар, даваць клятву, прынамсі «не нашкодзь». Бо слова можа не проста параніць — яно можа развязаць вайну.

— Паводле сацыялагічных даследаванняў, узроставы цэнз тэлевізійнай аўдыторыі сёння 55+. Эксперты гавораць, што тэлебачанне паступова памірае. Наколькі вы згодны з гэтым сцвярджэннем?

— Не зусім згодна. Прапаную перш за ўсё аддзяліць слова «тэлебачанне» ад тэлевізара, бо тэлебачанне — паняцце больш шырокае і глыбокае. Медыявымярэнне праводзіцца, калі прыстаўка прывязана да канкрэтнага тэлевізара. Але ж ёсць яшчэ тэлепрагляд у інтэрнэце. Таго ж Салаўёва большасць глядзіць у інтэрнэце, Тура глядзяць у інтэрнэце і ў «Тэлеграме». Тут няма даследаванняў, якія пацвярджалі б, што ў гэтых праграм больш сталая аўдыторыя. Пасля 2020 года, на мой погляд, адбыўся скачок у развіцці тэлебачання як тэлевізара. І гэта апраўдана. Калі на людзей зваліўся вялізны паток інфармацыі, вельмі многія вярнуліся да класічных сродкаў масавай інфармацыі, каб разумець дзяржаўны пункт гледжання і афіцыйную пазіцыю.

— Гэты год у вашай кар'еры адзначыўся новым прызначэннем. Вы ўзначалілі прадстаўніцтва МТРК «Мір» у нашай краіне. Калі ў кампаніі змяняецца кіраўнік, як правіла, запускаецца працэс стварэння каманды «пад сябе». Ці прыйшлося вам праводзіць такія пераўтварэнні?

— Калі я прыйшла на «Мір», то ўбачыла шмат знаёмых асоб, якіх так ці інакш ведаю дзякуючы шматгадовай тэлевізійнай дзейнасці. Каманду (асабліва кіраўнікоў) пад сябе фарміраваць не прыйшлося. Яны ўсе спецыялісты адказныя, кампетэнтныя, глыбока адданыя краіне і, безумоўна, знаходзяцца на сваіх месцах. У прадстаўніцтве працуюць 98 чалавек. Асноўная задача нашага вяшчання — прадстаўляць інтарэсы Беларусі за яе межамі. І перш за ўсё інфармаваць, а не даваць ацэнку.

— Куды сёння ідзе «Мір»?

— «Мір» ідзе ў інтэрнэт. Мы вырашылі, што наша прадстаўніцтва павінна быць паказана ў інтэрнэце даволі шырока. Быў створаны аддзел мультымедыйных праектаў. Мы асвоілі ТікТок, больш сур'ёзна пачалі працаваць у «Тэлеграме». Хай не выраслі ў колькасці падпісчыкаў, але індэкс цытаванасці, што вельмі важна, высокі. Нас пачалі заўважаць буйныя расійскія, украінскія тэлеграм-каналы. Такое ж развіццё сёння атрымлівае і наш сайт. Тэлевізійны час абмежаваны, а ў інтэрнэце можам прысутнічаць бязмежна. Людзі ў нас таленавітыя, кантэнт унікальны. Таму там акцэнт у бок беларускага свету.

— Вольга Аляксандраўна, існуе меркаванне, што кіраўнікі вельмі крытычна ставяцца да сваёй працы. Наколькі гэтая якасць прысутнічае ў вашай працы і жыцці? І які ў цэлым ваш стыль кіравання?

— Для мяне заўсёды важна ставіцца да людзей так, як хацела б, каб яны ставіліся да мяне. Я насамрэч стараюся ніколі не павышаць голас, імкнуся размаўляць, тлумачыць. Але я вельмі патрабавальная да выканання таго, што прашу. Раблю гэта ціха, але веру, што чалавек зробіць работу якасна і ў тэрмін. Вядома, да кожнай сітуацыі заўсёды падыходжу індывідуальна: мне важна разумець, ці па сілах пэўнаму супрацоўніку выканаць пастаўленую задачу. Да сябе стаўлюся вельмі крытычна, часам мне здаецца, што можна было б сябе і пашкадаваць. Але ж самыя непаспяховыя людзі — тыя, хто ўвесь час сябе шкадуе. «Мір» — гэта люстэрка. Калі ў цябе нешта не атрымліваецца, знайдзі ў сабе гэты момант і прапрацуй.

— Вы заўсёды прыязная і спагадлівая, у вас гараць вочы. Ці ёсць месца, дзе можаце перазарадзіцца, каб падтрымліваць унутраны агонь?

— Калі хачу перазагрузіцца, застаюся адна і займаюся чым-небудзь у кватэры: прыбіраю, перакладваю рэчы. Увогуле, раскладваю ўсё па палічках. Праз суткі выходжу з кватэры ў сваім звыклым спакойным эмацыянальным стане. Яшчэ адзін спосаб — паездка да бацькоў у Дзяржынск. Да майго прыезду тата заўсёды топіць лазню, і я гадзін на 4-5 сыходжу туды. Для мяне гэта месца поўнага ачышчэння.

— Зусім хутка Новы год. Раскажыце нашым чытачам, якія традыцыі святкавання чароўнага свята ёсць у вашай сям'і?

— Новы год для мяне — свята сямейнае. У гэты дзень мы заўжды прыязджаем да бацькоў. Нават мая сястра, якая жыве ў Балгарыі, толькі ў год пандэміі не здолела да нас далучыцца. У хаце абавязкова павінна быць жывая ёлка, з традыцыйных страў на стале — «Селядзец пад футрам» і салата «Аліўе». Неад'емная частка свята — культурная праграма. Як правіла, за забаўляльную частку адказвае мая сястра з пляменнікамі. З нецярпеннем чакаем гэтага Новага года, каб нарэшце сустрэцца і па-сямейнаму яго адсвяткаваць.

— З боем курантаў прынята загадваць жаданне. Што б вы пажадалі беларусам у новым годзе?

— Па-першае, правесці астатак года плённа і спакойна. А ў новым годзе хачу пажадаць усім міру: у сям'і, у душы, у бачанні свету. Міру як дома, дзе мы ўсе разам жывём і каштоўнасць якога кожны для сябе сам павінен разумець і берагчы.

Кацярына ТУМАС-ЦІШКЕВІЧ.
Фота з асабістага архіва гераіні.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

«МАБІЛЬНА З «АЛЕСЯЙ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Мабільна з «Алесяй» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі тэрмінам з 15 снежня 2021 года да 31 сакавіка 2022 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на часопіс «Алеся» на першы квартал 2022 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Мабільна з «Алесяй» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ, руб. кап.	Усяго з ПДВ, руб.кап.
1	Смартфон TECNO POP 2F(B1g) 1GB/16/GB (далей — прыз)	1	149,00	149,00

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Мабільна з «Алесяй» складае 149,00 (сто сорак дзевяць) рублёў 00 кап.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Мабільна з «Алесяй» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на часопіс «Алеся» на першы квартал 2022 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на часопіс «Алеся» на першы квартал 2022 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам копія квітанцыі падпіскі на часопіс «Алеся» на першы квартал 2022 года на адрас Установы ў перыяд з 15 снежня 2021 года да 24 студзеня 2022 года.

7. Квітанцыі, якія паступілі Установе пасля 24 студзеня 2022 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Мабільна з «Алесяй» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», старшыня Камісіі».

Члены Камісіі:

Ракоўская Ларыса Паўлаўна — шэф-рэдактар часопіса «Алеся»;

Быстрымовіч Валянціна Яфімаўна — рэдактар аддзела рэдакцыі часопіса «Алеся» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Шыманская Алена Міхайлаўна — вядучы спецыяліст аддзела рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗА. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦУ

11. Розыгрыш прыза ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 28 студзеня 2022 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу ўсе квітанцыі ўдзельнікаў змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца прыз.

13. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або члены Камісіі. На картцы ўдзельніка распісваюцца члены Камісіі.

14. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 8 лютага 2022 года ўключна ў газеце «Звязда», а таксама ў часопісе «Алеся» № 2 2022 года.

Установа ў тэрмін да 8 лютага 2022 года дасылае пераможцу паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗА

15. Умовай выдачы прыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на часопіс «Алеся» на першы квартал 2022 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на часопіс «Алеся» на першы квартал 2022 года.

16. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на часопіс «Алеся» на першы квартал 2022 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

17. Прыз выдаецца пераможцу ў тэрмін да 31 сакавіка 2022 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонах: (017) 271 81 53, 311 17 40 для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможца па атрыманне прыза, установа не аплачвае.

18. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

19. Пасля 31 сакавіка 2022 года выдача прыза спыняецца і прэтэнзіі ўдзельніка не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

20. Пераможца Гульні нясе адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прыза.

21. Пераможца Гульні і яго сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

22. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Мабільна з «Алесяй» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

23. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах: (017) 271 81 53, 311 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4124 ад 08.12.2021 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Узденский райисполком 12 января 2022 г. в 11.00 по адресу: Минская область, г. Узда, ул. Советская, 22, (кабинет № 213) проводит открытый аукцион (Лот № 1) и повторный открытый аукцион (Лот № 2) (далее – Аукцион) по продаже нижеперечисленных в таблице не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилых домов и предоставлении их победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	Кадастровый номер, S (га)	Начальная цена, бел. руб.	Недвижимое имущество (не завершенное строительством, незаконсервированное строение)	Расходы по подготовке, бел. руб.	Примечание
Лот № 1	Узденский райисполком	г. Узда, ул. Полевая, уч. 5	625650100002000196 0,1498 га	19 726,22	Фундамент	282,22 и расходы на публикацию	Имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению
Лот № 2	Узденский райисполком	г. Узда, ул. Первомайская, уч. 128	625650100001000490 0,1500 га	23 931,00	Фундамент (блоки ФБС)	306,21 и расходы на публикацию	Имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

Аукцион будет проводиться в порядке, установленном пунктами 20–33 Положения о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 марта 2018 г. № 220 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 26 декабря 2017 г. № 463».

Начальная цена предмета аукциона (лот № 1) – 19 726, 22 белорусского рубля, в том числе:

начальная цена не завершенного строительством жилого дома – 3 226, 22 белорусского рубля;

начальная цена продажи земельного участка – 16 500,00 белорусского рубля;

затраты на организацию и проведение аукциона составляют 282,22 белорусского рубля.

Начальная цена предмета повторного аукциона (лот № 2) – 23 931,00 белорусского рубля, в том числе:

начальная цена не завершенного строительством жилого дома – 5 931,00 белорусского рубля;

начальная цена продажи земельного участка – 18 000,00 белорусского рубля;

затраты на организацию и проведение аукциона составляют – 306,21 белорусского рубля.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены предмета аукциона перечисляется в срок **не позднее 10 января 2022 г.** платежным поручением (квитанцией) на расчетный счет № BY18AKBB 36006310025120000000 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 600537220, код платежа 4707, назначение платежа: задаток для участия в аукционе.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении двух лотов, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих лотов.

Заявление на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Минская область, г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет № 407 заместителем начальника отдела жилищно-коммунального хозяйства, архитектуры и строительства Узденского райисполкома с 08.30 по 17.30 в рабочие дни. Окончательный срок приема заявлений с необходимыми документами **10 января 2022 г. с 08.30 по 17.30.**

Участники аукциона, которыми могут быть граждане Республики Беларусь и негосударственные юридические лица Республики Беларусь, подают следующие документы:

заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона;

документ о внесении суммы задатка с отметкой банка.

Кроме того в комиссию по проведению аукциона или Узденский райисполком по вышеуказанному адресу участниками аукциона представляются:

гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – доверенность оформленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Заключительная регистрация участников аукциона – с 09.00 до 10.25 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

Порядок осмотра на местности предмета аукциона осуществляется путем самостоятельного выезда желающими принять участие в аукционе к месту нахождения объектов.

Контактные телефоны председателя и секретаря комиссии: **8 (01718)-65-4-75, 51-6-70; моб. тел.: 8 (033) 604-49-71.**

ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7»

извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 28 декабря 2021 г. внеочередного общего собрания по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, пом. 5

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ

1) Выкуп Обществом акций собственного выпуска с целью аннулирования.

Место проведения собрания: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, пом. 5.

Начало работы собрания в 11.00.

Регистрация участников собрания с 10.00 до 10.50 в день проведения собрания по месту его проведения. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 15 декабря 2021 г.

Орган, созывающий собрание: Совет директоров Общества, основание созыва: протокол от 03.12.2021 № 03-12/2021.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 06.12.2021, по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, пом. 5.

Совет директоров ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7»

УНП 100088916

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» информирует о проведении 27.12.2021 г. аукциона по продаже имущества ОАО «Могилевхимволокно»

Лот № 1 – капитальное строение с инв. 700/С-49636 –

Машиносчетная станция и АТС,

площадь – 1008,6 кв. м, расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000003006368 (площадь 0,2141 га, право аренды) по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Челюскинцев, 87.

Тротуарная дорожка от центральных ворот и ограждение (инв. № 2070202010, № 2030098900).

Начальная цена продажи: 278 425,60 бел. руб. с учетом НДС.

Аукцион состоится 27 декабря 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.** Информация о предыдущем аукционе была размещена в газете «Звязда» от 17.09.2021

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел**: +37522-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**

Экономическим судом Гродненской области 14.10.2020 г. возбуждено производство по делу № 69-10Б/2020 об экономической несостоятельности (банкротстве) иностранного общества с ограниченной ответственностью «ДТ-групп» *(УНП 590910014, 230005, Гродненская область, г. Гродно, ул. Гаспадарчая, д. 29-1, каб. 502)* и открыто конкурсное производство.

Определением экономического суда Гродненской области от 14.01.2021 г. по делу № 69-10Б/2020 антикризисным управляющим в деле об экономической несостоятельности (банкротстве) ИООО «ДТ-групп» назначено общество с ограниченной ответственностью «Капитал Диалог».

На основании определения экономического суда Гродненской области от 30.11.2021 г. по делу № 69-10Б/2020, руководствуясь ст. 94 Закона Республики Беларусь «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» **управляющий уведомляет о проведении общего собрания кредиторов ИООО «ДТ-групп» 20.12.2021 г. в 11.30 по адресу: Гродно, ул. Стефана Батория, 8 (конференц-зал отеля «НЕМАН»),** на котором будет рассмотрен вопрос о защите требований ИМНС Республики Беларусь по Ленинскому району г. Гродно на сумму 179 486,66 рублей.

Ознакомление с предъявленными требованиями и выдвинутыми возражениями состоится **16.12.2021 г. с 11.00 до 13.00** по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 221.

Утерянный договор страхования зеленая карта РФ 1 год серия BY/07 № 20792640 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375212 24-63-12, +37529 510-07-63.
Продавец: открытое акционерное общество «Витязь», 210605, Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, тел. +375 212 26-55-08.

Лот № 1. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86275, площадью – 888 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б/4, готовность строения – 46 %. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86269, площадью – 449,5 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б/1, составные части и принадлежности: две пристройки, готовность строения – 42 %, готовность двух пристроек – 62 %. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86271, площадью – 288,6 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б/3, составные части и принадлежности: крыльцо, готовность строения – 68 %, готовность крыльца – 100 %. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86273, площадью – 4722,8 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б/2, готовность строения – 39 %. Незавершенное законсервированное капитальное строение инв. № 200/U-86266, площадью – 1296,1 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б, составные части и принадлежности: пристройка, навес, готовность строения – 47 %, готовность пристройки – 52 %, готовность навеса – 74 %. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым № 240100000003000151 (право аренды) площадью 3,9294 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский,17Б, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания автотранспортного предприятия. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Кап. строение (одноэтажное металлическое здание склада газобаллонов (площадка 3) с инв. № 200/С-72741 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, д. 64В/1, площадью 173 кв. м, наименование – склад газобаллонов (площадка 3), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение (одноэтажное кирпичное здание КПП-18) с инв. № 200/С-72772 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, д. 64В/4, площадью – 22 кв. м, наименование – КПП-18, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-78666 протяженностью – 299,8 м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, участок железной дороги Лучеса-Придвинская, 5 км, станция Журжево, подъездной железнодорожный путь № 33, наименование – подъездной железнодорожный путь № 33, назначение – сооружение специализированное железнодорожного транспорта, составные части и принадлежности: участок подъездного железнодорожного пути № 33, расположенное на зем. участках с кадастровыми №№ 240100000003007556, 240100000003007151, 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-101966 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, телефонная канализация к зданиям №№ 64В, 64В/2, 64В/3, 64В/4, протяженность линейного сооружения – 343,3 м, наименование – телефонная канализация, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-101967 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, водопровод хозпитьевой к зданиям №№ 64В, 64В/2, 64В/3, протяженность линейного сооружения – 780,1 м, наименование – водопровод хозпитьевой, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-101971 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, канализация хозфекальная от зданий №№ 64В, 64В/2, 64В/3, протяженность линейного сооружения – 445,4 м, наименование – канализация хозфекальная, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-101972 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, наружное освещение вблизи зданий №№ 64В, 64В/1, 64В/2, 64В/3, 64В/4, протяженность линейного сооружения – 429,4 м, наименование – наружное освещение, назначение – сооружение специализированное энергетики, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-101973 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, склад ГСМ вблизи здания № 64В, наименование – склад ГСМ, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, составные части и принадлежности: емкость, емкость, емкость, молниеотвод, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-101974 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, канализация ливневая от зданий №№ 64В, 64В/2, 64В/3, протяженность линейного сооружения – 970,6 м, наименование – канализация ливневая, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-102120 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, наружная теплотрасса к зданиям №№ 64В, 64В/2, 64В/3, 64В/4, протяженность – 306,9 м, наименование – наружная теплотрасса, назначение – сооружение специализированное энергетики, составные части и принадлежности: шесть участков сети, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение (двухэтажное панельное здание складского корпуса № 1 (площадка 3) с рампой) с инв. № 200/С-72898 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, д. 64В, площадью 2920 кв. м, наименование – складской корпус № 1 (площадка 3), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: рампа, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение (двухэтажное смешанной конструкции здание складского корпуса № 2 с рампой) с инв. № 200/С-72749 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, д. 64В/2, площадью 2396 кв. м, наименование – складской корпус № 2 (площадка 3), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: рампа, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение (двухэтажное кирпичное здание склада ОМТС с бытовыми помещениями (корпус 3) с инв. № 200/С-72750 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, д. 64В/3, площадью 1883 кв. м, наименование – склад ОМТС с бытовыми помещениями (корпус 3), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кап. строение с инв. № 200/С-101970 площадью 13216 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, д. 64 В, благоустройство территории, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение многофункциональное, составные части и принадлежности: проезжая часть, ограждение, трое ворот, две калитки, две крановые эстакады, громоотвод, расположенное на зем. участке с кадастровым № 240100000001000255. Кран мостовой электрический КМПЭ-1,0 с инв. № 88400321, кран мостовой электрический КМПЭ-1,0 с инв. № 88400318, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 64В/1. Кран мостовой электрический КМПЭ-1,0 с инв. № 95400420 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 64В/2. Кран мостовой опорный электрический с кабиной 10-5К-14-12-У1 с инв. № 92400397, кран мостовой электрический КМПЭ-3,2 с инв. № 85400217, кран мостовой электрический КМПЭ-3,2 с инв. № 85400198, кран мостовой электрический КМПЭ-5 с инв. № 86400234, кран мостовой электрический КМПЭ-5 с инв. № 86400235, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 64В.

Имущество расположено на: земельный участок с кадастровым № 240100000001000255 (право постоянного пользования) площадью 3,3970 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 64В, назначение – земельный участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности; земельный участок с кадастровым №№ 240100000003007151 (право аренды) площадью 0,0209 га, назначение – земельный участок для содержания и обслуживания подъездной дороги к котельной «Южная», земельный участок с кадастровым № 240100000003007556 (право аренды) площадью 0,0059 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 64, назначение – земельный участок для содержания и обслуживания подъездной дороги к котельной «Южная».

Начальная цена: 2 533 119,18 бел. руб. без учета НДС.
Задаток: 253 311,91 бел. руб.

Обременение по лоту № 1: запрещение совершения регистрационных действий. Письмо управления принудительного исполнения Главного управления юстиции Витебского облисполкома от 22.06.2021 № 20121/21553: запрет на совершение регистрационных действий будет снят при условии перечисления покупателем денежных средств за приобретенный предмет аукциона на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 27.12.2021 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 10.12.2021 с 08.30 по 24.12.2021 до 17.30. Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 02.10.2021, 03.11.2021, 23.11.2021.

Условия повторного аукциона: Победитель аукциона (единственный участник) обязан: в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона; оплатить НДС сверх цены продажи предмета аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи.

Аукцион проводится в порядке, установленном Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 05.05.2009 г. «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» и Положением «О порядке организации и проведении торгов по реализации имущества ОАО «Витязь» от 13.04.2021. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

Доп. информацию можно получить по тел.: +375 (212) 24-63-12, +37529 510-07-63, +375 44 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: 8-0212-265383.

ЖАРСЦІ ПА КАШТАРЫСЕ

Даўно гэта было, яшчэ пры Шушкевічы. Кіраўнік адной з жыллёва-камунальных кантор у нейкую зусім не цудоўную раніцу атрымаў з выканкама афіцыйную паперу на беларускай мове. У ёй разам са звыклымі «палепшыць...», «забяспечыць...» ды «наладзіць кантроль» змяшчаўся пункт, які ледзьве не ўвёў у ступар. Там было прадпісана падрыхтаваць для ўзгаднення і зацвярджэння план работ на будучы год і... «каштарыс».

Беларускай мовай дырэктар валодаў трошкі лепш, чым японскай, якой ён не валодаў зусім, таму слова «каштарыс» паўстала перад ім упершыню і літаральна загнала ў кут. Па сённяшнім часе выйсце ўмомант знайшлося б, а тады...

Ніякіх камп'ютараў з гугламі яшчэ не было, так што дырэктару прыйшлося адключыць усе тэлефоны і самому паглыбіцца ў пакутлівы роздум на тэму, што ж рабіць. Звярнуцца па тлумачэнне да вышэйшага начальства азначала б засведчыць сваю неадукаванасць (з усімі адсюль наступствамі...), спытацца пераклад у падначаленых — падарваць аўтарытэт...

Па селектары патурбаваў сакратарку.

— Восем літар, — тут жа сказала Света. — Пераклад можна знайсці ў слоўніку.

Аднак спачатку трэба было знайсці сам слоўнік.

А таму дзяўчына, заціснуўшы ў кулачок чырвонец, рушыла ў паход па крамах і кнігарнях...

Куды канкрэтна яна хадзіла, гісторыя замоўчвае, але назад вярнулася гадзіны праз дзве і з тым самым чырвонцам: слоўніка нідзе не было.

Пасля абеду дырэктар сабраў намеснікаў і галоўных спецыялістаў, аднак што такое каштарыс, не ведалі і яны. Праўда, галоўны інжынер успомніў, што іх кадравічка родам з-пад Лагойска, вучылася ў беларускамоўнай школе. Значыць, адказ на гэту загадку можа ведаць...

Жанчына, якую пачціва запрасілі ў шаноўную кампанію, была яўна не ў гуморы (адарвалі ад важных спраў), але ж спехам патлумачыла, што каштаваць азначае «пробаваць на вкус», а рыса — гэта «черта», напрыклад — «черта характера»...

Пасля такога тлумачэння «справа» з каштарысам пацямнела яшчэ больш, і дырэктару ўжо нічога не заставалася, як «распусціць» нараду: усіх і кожнага нацэліць на пошукі яснасці. Ім жа, гэтым пошукам, ён заняўся і сам...

Праўда, праблема знікла гэтак жа раптоўна, як і з'явілася: у кантору патэлефанаваў загадчык аддзела гарвыканкама і пацікавіўся: «Как обстоят дела с планом і сметой?»

— С ка-какой Светой? — перапытаў ледзь жывы ад страху дырэктар, падумаўшы, што нейкая падла ўсё ж данесла пра яго нефармальныя зносіны з сакратаркай.

— Да со сметой расходов — з каштарысам? Ты што, гэтага слова не ведаў?

— Ну, не тое... — скінуўшы камень з душы, зацягнуў быў дырэктар.

— ...А я — ведаў, — сам сябе пахваліў той начальнік і павучальна дадаў. — А табе, выходзіць, трэба яшчэ мову падцягваць — на курсы запісацца, беларускія кніжкі пачытаць... А калі не пад сілу, то пачынай з часопісаў, з газет.

І дырэктар, вядома ж, пачаў, раз начальства сказала...

Дарэчы, пра каштарыс. У тыя ж часы ў адным будаўнічым упраўленні мянялі шыльды на дзвярах. Зняўшы старую з надпісам «инженер-сметчик», мастак стаў пісаць новую — «інжынер-каштарыснік». Апошняе слова ці то не змяшчалася, ці то здалося задоўгім... І ён скараціў: на дзвярах з'явілася шыльда «інжынер-каштарык»...

Гэту мянушку спецыяліст пранасіў да выхаду на пенсію. І добра, што жыў не ў вёсцы. Там — яшчэ і дзецям бы мог перадаць.

Лявон Перагуд,

г. Мінск.

«ДОБРЫ ДОКТАР БОБРЫК, але страшны ножык...»

Пра людзей у белых халатах сёння гаворыцца шмат: ім, медыкам, адрасуюцца словы падзякі, апявающа іх гераізм і майстэрства... Усё гэта правільна і ўсё праўда, як, зрэшты, і тое, што некалі даўно адбылося са мной.

Тады, пасля вучобы ў інстытуце, я на два гады (размеркаванне!) трапіў у глыбінку, у адну досыць далёкую вёску. Працы там было шмат, часам нялёгкай, руціннай, але ж для мяне цікавай і нават творчай. Так што будні праляталі, можна сказаць, непрыкметна. А ў выхадныя чакалася свята: паход у лазню. Той гаспадар яе толькі што адкрыў, не мог нарадавацца, а таму запрашаў і радню, і сяброў, і проста знаёмых...

Дык вось. Неяк раз мы з мужчынамі памыліся. Потым па традыцыі (пасля лазні, кажуць, кальсоны прадай, але выпі) селі за стол, дзе чаго толькі ні было: салёныя агурочкі і грыбочкі, квашаная капуста, паляндвічка, сальцісон...

Я выпіў, нешта пакаштаваў і... схапіўся за жывот. Ён, трэба сказаць, і да лазні крыху непакоіў, але ж я не звяртаў увагі: думаў, што пабаліць ды пройдзе. А тут чую — не... Скруціла так...

Прыйшлося пакінуць прыемнае застолле, пабудзіць калгаснага шафёра — папрасіць, каб завёз у бальніцу.

Да яе, найбліжэйшай, было кіламетраў восем, а недзе на пятым, на скрыжаванні, нас спыніў міліцэйскі патруль. Шафёр, помню (я побач сядзеў), аж застагнаў ад гэтай неспадзяванкі, бо напярэдадні трохі выпіў (субота ж, лазневы дзень)...

На шчасце, стан кіроўцы міліцыю зусім не цікавіў (шукалі збеглага з турмы рэцыдывіста), а вось мой...

Праўду кажуць, што ўсюды ёсць і людзі, і нелюдзі. Мне пашчасціла, бо далей наша машына памчала ўслед за міліцэйскай — з мігалкай.

...Першае, аб чым мяне спыталі ў бальніцы (хірурга там не было): што еў і што піў. Пачуўшы слова грыбы, тут жа прызналі атручэнне і сталі лячыць: гэта значыць, прамываць страўнік і калоць нешта для абязбольвання, каб зменшыць пакуты.

Аднак усё гэта было марна: ні ў той дзень, ні назаўтра мне лепш не стала. У фельчара з тэрапеўтам з'явілася падазрэнне на апендыцыт, і мяне вырашылі адправіць у адну з раённых бальніц.

...Там быў хірург — малады і не вельмі смелы. Убачыўшы, відаць, што справы мае — дрэнь, ён пабаяўся браць на сябе адказнасць — ноччу падняў «старога».

Той, яшчэ заспаны (выхадныя ж!), зноў агледзеў мяне, зноў спытаў, чым лячылі, і сказаў кароткае: «На стол».

...На такім вось, аперацыйным, я быў упершыню і таму не ведаў, чаго чакаць. Са здзіўленнем глядзеў, як мяне за рукі, за ногі прывязваюць да стальніцы, робяць укол у жывот (відаць, зноў для абязбольвання?), пачуў яшчэ ад хірурга, што будзе балець — «немножко».

А забалела мне так... На сцяну, здаецца, палез бы!..

Але ж стагнаць ды крычаць не выпадала: побач былі медсёстры, жанчыны. Адна з іх проста не паспявала сціраць мне пот...

Колькі працягвалася аперацыя, сказаць не магу... У канцы хірург паказаў мне «здабычу» — нешта цёмна-чырвонае, падобнае на палец. Сказаў: «Апендыкс... Яшчэ хвілін дваццаць, і ён бы лопнуў».

...Трохі перавёўшы дух і абапёршыся на плечы медсястры, я неяк дапоўз да палаты, лёг і толькі потым прыгадаў, што такую ж аперацыю рабілі Коласу, і пасля яе Максім Лужанін напісаў верш:

«Добры доктар Бобрык,
Але страшны ножык:
Выража апендыкс,
Пакладзе на ложак...
Час усё загоіць,
Час усё заліжа.
Дзякуй, дзядзька Бобрык,
Што не рэзаў ніжай».

Як сведчыць гісторыя, два апошнія радкі ў гэтым творы «завастрыў» сам дзядзька Якуб...

Якое прозвішча насіў мой хірург, на жаль, не ў памяці. Чаму ён аперыраваў без наркозу, не ведаю.

Дзеля чаго расказваю? Дзеля таго, каб заклікаць людзей цаніць жыццё і шанаваць уласнае здароўе. А калі што — не зацягваць, не спадзявацца на «авось» — своечасова звяртацца да ўрачоў.

Мікалай Арлоў,

г. Орша.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

Бацькі і дзеці,
або Тургеневу можа адпачыць

РАЗМАЎЛЯЛА нядаўна з прыяцелькай, якая мае шчасце працаваць псіхатэрапеўтам. «Мае шчасце», бо ў апошнія пару-тройку гадоў праблема, як зарабіць не толькі на хлеб надзённы, але і на масла, а то й на ікру, каб на гэты хлеб намазаць, у яе не стаіць увогуле. Акрамя працы ў медустанове, у яе яшчэ прыватная практыка. Цяпер у сувязі з пандэміяй яна палову яе перанесла ў рэжым анлайн — праводзіць лячэбныя сеансы па тэлефоне або па відэасувязі, грошы ж на картку «капаюць» што ні ёсць рэальныя — дзевяноста рублёў за паўтары гадзіны. Кліентаў, кажа, хоць адбаўляй, нават папярэдні запіс ёсць.

Яшчэ яна, спецыяліст з дваццаціпяцігадовым стажам, падзялілася вось якім назіраннем. За апошнія гадоў пяць тыповы партрэт яе пацыента змяніўся кардынальна. Раней гэта былі жанчыны трыццаці-сарака гадоў, як правіла, з праблемамі ў асабістым жыцці або мужчыны пад пяцьдзясят, якія перажылі нейкую вялікую жыццёвую драму або кінулі піць і баяліся сарвацца. Цяпер жа гэта ўсё часцей людзі маладыя — 25—30-гадовыя. «Ну, сёння модна хадзіць на ўсякія духоўныя практыкі або да псіхолага. А табе й добра», — паспрабавала пажартаваць з яе. «Не, ты ведаеш, тут не ў модзе справа. Яны абсалютна не гатовыя да жыццёвых цяжкасцяў, і калі такія цяжкасці здараюцца — няважна, дзе: у асабістым жыцці, на вучобе ці на працы, у адносінах з бацькамі — тут жа надломваюцца псіхалагічна. І гэта сур'ёзна: калі з імі не працаваць — можа скончыцца вельмі дрэнна. Але, акрамя іншага, многім даводзіцца літаральна на пальцах тлумачыць, што гэта проста жыццё...»

Я пасля доўга думала пра тое, чаму ў нас вырастаюць такія інфантыльна-бездапаможныя дзеці. Якія, нават умудрыўшыся нарадзіць сваіх дзяцей, не ўмеюць ці не хочуць станавіцца дарослымі. Можа, вінаватыя мы самі? Як вінаватыя ў заняпадзе вёскі, што цяпер вялікімі намаганнямі і сродкамі спрабуем адрадзіць, нашы вясковыя бацькі, якія паўтаралі нам з маленства: «Толькі ж ты не заставайся ў вёсцы», бо проста хацелі, каб мы мелі ванну з гарачай вадой і прыбіральню не на вуліцы? Так і мы, бацькі сённяшніх дваццаціпяцігадовых, гадавалі іх у цяплічных умовах. Каб ім было лепш, чым нам, якія ў студэнцкія 90-я, бы галодныя сабакі, бегалі па горадзе, шукаючы, дзе зарабіць і чым пракарміцца. Але ж гэта нармальна — калі бацькі хочуць, каб дзеці жылі лепш, чым яны, праўда?

ТОЛЬКІ ў гэтым сваім жаданні мы забыліся, мне здаецца, аб вельмі важным моманце — выбудаваць шкалу аўтарытэтаў. Тое, на чым спрадвеку трымаліся папярэднія пакаленні. Жыццёвы вопыт дзядулі, бабулі, а тым больш уласных бацькоў знівеліраваўся да «вы нічога не разумееце, вы ўсё рабілі няправільна». Яны сёння не перарастаюць гэта абсалютна падлеткавае сцвярджэнне. Пераходны ўзрост мінае, а яно застаецца дэвізам іх адносін з намі. Жыццёвы досвед — нішто, калі ты не валодаеш камп'ютарнай граматай ці не ведаеш слоўцаў кшталту «хейт» або «аверсайз». Мы маўкліва з гэтым пагаджаемся, употай шукаючы ў сеціве той няшчасны «аверсайз», нам здаецца, што так мы станем да іх бліжэй. Але пры гэтым не асабліва стараемся рабіць іх бліжэй да нас. Ведаю адну маладую жанчыну, якая да трыццаці гадоў не ведала, хто быў па прафесіі яе... родны дзед. Які жыў не недзе там на Камчатцы, а ў суседнім раёне. Яшчэ адна маладая знаёмая, ужо пайшоўшы з-за разрыву з хлопцам да псіхолага, пачала раптам цікавіцца ў бабулі пра лёс жанчын у сям'і. Па рэкамендацыі псіхолага (!) — дагэтуль (да дваццаці сямі гадоў) ёй гэта было непатрэбна і нецікава, а старэйшыя і не спрабавалі расказваць (а навошта дзіцяці ўсе гэтыя сямейныя драмы і хітраспляценні ведаць?).

